

ЯК ПЕРАЖЫЦЬ ГАРАЧУЮ ПАРУ ГОДА

7

ЦІКАВОСТКІ «МАЛАДЗЕЧНА-2023»

9




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 ЧЭРВЕНЯ 2023 г. АЎТОРАК № 111 (29991)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй МАТЭЛЬСКІ, дырэктар Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі:**

*«Штучны інтэлект — частка нашай аб'ектыўнай рэальнасці, таму мы павінны разумець, як эфектыўна і бяспечна спалучаць новыя інфармацыйныя тэхналогіі з класічнымі. Сёння НЦПІ вырашае адказную задачу па пераводзе ўсёй нарматворчай дзейнасці выключна ў лічбавы фармат узаемадзеяння. Цалкам лагічна, што чарговым глабальным этапам развіцця стане ўкараненне ў нарматворчасць (і ў права ў цэлым) тэхналогій наступнага пакалення, а менавіта тэхналогій штучнага інтэлекту».*

# Гэта вам не цацкі!



На X Мінскім адкрытым робатурніры — фінальным этапе беларускага Кубка па адукацыйнай робататэхніцы, які праходзіў у Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку, спаборнічалі ўдзельнікі з васьмі гадоў. Верхняя ўзроставая планка не была ўстаноўлена. Самаму «дарасламу» спартсмену Аляксандру ПАСТАЯЛКУ, які прадстаўляў сярэднюю школу вёскі Чэрні Брэсцкага раёна, — пяцьдзясят гадоў. Ён прыехаў на турнір з хлопцамі, якія займаюцца ў яго гуртку па робататэхніцы Максімам КАЗІНЦАВЫМ і Уладзіславам КУМЕЙШАМ. Сам Аляксандр у камандзе сумяшчае абавязкі трэнера і ўдзельніка. На турніры каманда з Чэрняў паказала добры вынік, заняўшы прызавыя месцы ў чатырох катэгорыях спаборніцтваў.

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

## КОРАТКА

- **Тыдзень моладзі і студэнцтва стартуе ў Беларусі 19 чэрвеня.**
- **Білеты на канцэрты адкрыцця і закрыцця «Славянскага базару ў Віцебску» ўжо распрададзены.**
- Новы метад апаратнага трамбацытаферэзу пачалі прымяняць у цэнтры трансфузіялогіі ў Віцебску.
- **«Музычныя вечары ў Мірскім замку» пройдуць 16 і 17 чэрвеня.**



- Nordwind Airlines запусціць прамыя рэйсы з Пскова ў Мінск з 19 ліпеня.

Прыродны фактар

## ЗАПАСЫ ЁСЦЬ, АЛЕ...

### Пакуль патэнцыял мінеральных крыніц выкарыстоўваецца слаба




**Дактары сцвярджаюць, што мінеральная вада — вельмі спрыяльны лячэбны і прафілактычны фактар. Усе санаторыі зацікаўленыя ў тым, каб мець уласную крыніцу. Але толькі трэцяя частка беларускіх здраўніц мае яе. Між тым, некаторыя айчынныя віды параўнальныя з водамі знакамітых санаторыяў, такіх як Моршын, Трускавец, Друскінінкай. Ці ў поўнай меры выкарыстоўваюцца лекавыя крыніцы ў нашай краіне?**

СТАР. 4

І мы там былі...

## Пад знакам ільну

**На Аршаншчыне ў трэці раз прайшло брэндавае раённае свята «ИзумЛЁНный край». Карэспандэнт «Звязды» завітала ў тэкстыльную сталіцу і даведалася, што цікавага падрыхтавалі для гасцей і жыхароў горада арганізатары.**

СТАР. 8



ISSN 1990 — 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе**

**Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай**

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!**

# НАКІРАВАНЫ Ў БУДУЧЫНЮ

## У мінулыя выхадныя Наваполацк адзначыў 65-годдзе

**«Адзін з самых маладых гарадоў, якія дынамічна развіваюцца, з'явіўся на карце нашай краіны дзякуючы самаадданасці і працоўнаму энтузіязму будаўнікоў. Наваполацк за кароткі тэрмін стаў буйным навукова-прамысловым цэнтрам, сталіцай беларускай нафтахіміі. Сёння накіраваны ў будучыню горад пастаянна расце і прыгажэе. Актыўна мадэрнізуючы вытворчасці, асвойваючы новыя віды прадукцыі і рынкі, Наваполацк уносіць значны ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі, з'яўляецца флагманам Віцебскай вобласці і краіны ў цэлым па многіх напрамках у прамысловасці і сацыяльна-культурнай сферы», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў сваім віншаванні гараджанам. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што новапалачане па праве могуць ганарыцца сваімі поспехамі ў эканоміцы, навуцы, адукацыі і спорце. Пры гэтым беражліва захоўваецца гістарычная спадчына і культурныя традыцыі старажытнай полацкай зямлі, на якіх выхоўваецца маладое пакаленне.**



Фота БелТА.

Адзначалі юбілей у Наваполацку з размахам. Святочныя мерапрыемствы стартавалі з урачыстага шэсця.



Разам з новапалачанамі на чале шэсця прайшлі прадстаўнікі міністэрстваў і ведамстваў, абласной і гарадской улады, грамадскіх аб'яднанняў. Цёпла і з апладысментамі сустракалі жыхары горада Старшыню Савета Рэспублікі Наталлю Качанаву, якая была кіраўніком гарвыканкама і ўнесла вялікі ўклад у развіццё горада.

Размаўляючы з журналістамі, Наталля Качанава прызналася: «Я гэты горад вельмі люблю. Як






Полацк, так і Наваполацк — мой родны горад. Я вырасла з ім, мы амаль равеснікі. Я заўсёды маю тут пачуццё радзімы, пачуццё дому, цеплыню ў душы. Кожны раз, калі прыязджаю сюды, адчуваю сябе на сваёй роднай зямлі. Я адчуваю выключна любоў ды падзяку да ўсіх, хто тут жыве, працуе, працягвае добрыя і слаўныя традыцыі горада», — сказала Наталля Качанава.

Яна адзначыла, што ў такое свята ў гараджан і гасцей горада цудоўны настрой.

«Наваполацк заўсёды адзначае свой дзень нараджэння шырока і маштабна. Сёння новапалачане адчуваюць асаблівы гонар за свой горад, за тое, што яны зрабілі за такі непрацяглы з пункту гледжання гісторыі перыяд — 65 гадоў. Здавалася б, гэта не так шмат, а сёння Наваполацк — прамысловы, адукацыйны, культурны цэнтр нашай краіны і Віцебскай вобласці. Мы ўдзячныя новапалачанам за тое, што яны робяць для свайго горада, для эканомікі краіны. Нізкі паклон усім, хто стаяў каля вытокаў станаўлення горада і будаўніцтва нафтаперапрацоўчага завода — гэта нашы першабудаўнікі, ветэраны, якімі па праве ганарыцца і горад, і краіна. Яны здзейснілі працоўны подзвіг, пабудаваўшы такі выдатны горад і найбуйнейшы ў Еўропе нафтахімічны комплекс. Слава нашым працаўнікам, гораду, няхай ён прырастае новымі новапалачанамі, што будуць перадаваць гэтыя слаўныя традыцыі з пакалення ў пакаленне», — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

У юбілейны год горад носіць гордае званне маладзёжнай сталіцы Беларусі. Актыўная моладзь пранесла па цэнтральнай вуліцы Наваполацка сцяг горада пад гукі духавога аркестра і бой барабанаў чароўных мажарэтак.

Госці свята здзейснілі своеасаблівы экскурс у гісторыю ад першай палаткі будаўнікоў горада да сучаснасці.

У святочнай калоне прайшлі прадстаўнікі бударганізацый, якая стаяла каля вытокаў узвядзення Наваполацка, — трэста № 16, і ўжо вядомых далёка за межамі краіны прадпрыемстваў, такіх як заводы «Нафтан» і «Палімір». Прамыслоўцы, урачы, педагогі, ветэраны працы, юныя зоркі спорту і мастацтва, ганаровыя грамадзяне Наваполацка, госці з гарадоў-пабрацімаў атрымалі сваю порцыю прывітанняў ад калег, сяброў і знаёмых, якія выстраіліся ў жывы калідор па дарозе шэсця і здымалі відэа і фота на тэлефоны.

Урачыстая калона прайшла да плошчы Будаўнікоў, дзе для гасцей і ўдзельнікаў свята адбыўся яркі канцэрт з удзелам творчых калектываў горада.

**Паводле БелТА.**

Наша пазіцыя

# ПАД ЧЫЮ ДУДКУ СКАЧА МАП?

**Гэтымі днямі ў Жэневе праходзіць штогадовая сесія Міжнароднай канферэнцыі працы. Прадстаўнікі работнікаў, работадаўцаў і ўрадаў са 187 дзяржаў — членаў МАП (Міжнароднай арганізацыі працы) аналізуюць сітуацыю з умовамі працы, занятасцю, узроўнем сацыяльных гарантый кожнай з краін-удзельніц.**

**Беларусь на пляцоўцы МАП спрабуюць абвінаваціць у тым, што нібыта людзі не маюць магчымасці аб'ядноўвацца ў прафсаюзы і заключаць калектыўныя дагаворы. Пад націскам прадстаўнікоў заходніх краін Міжнародная арганізацыя працы фактычна прапануе ўвесці чарговыя абмежавальныя меры да працоўных Беларусі. У той жа час вялікая колькасць краін выступае і ў падтрымку рэспублікі.**

**Сваю прынцыповую пазіцыю выказалі на пляцоўцы канферэнцыі і прадстаўнікі беларускай дэлегацыі.**

**Старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл ОРДА** звярнуў увагу ўдзельнікаў мерапрыемства, што яны з'яўляюцца сведкамі неправамерных і незаконных дзеянняў: «Тыя людзі, якія называюць сябе свабоднымі прафсаюзамі Беларусі і якія павінны абараняць работнікаў, патрабуюць увесці санкцыі супраць працоўных сваёй жа краіны, заклікаюць нанесці ім шкоду і ўрон. Гэта не што іншае, як здрада інтарэсам людзей. Прафсаюзы не павінны гэтага рабіць. Калі вы наносіце шкоду людзям, хочаце іх пазбавіць працы і зарплаты, значыць, вы не прафсаюзы. МАП не мае юрыдычнага і маральнага права падтрымліваць гэтыя антычалавечныя патрабаванні».

На гэта, паводле яго слоў, указваў і спецдакладчык ААН у сваім спецыяльным звароце ў адрас канферэнцыі: аднабаковыя абмежавальныя меры парушаюць Статут ААН, і МАП не павінна прымаць рашэнні, якія заахвочваюць санкцыі. «Аднак мы сёння бачым, што пазіцыя кіруючых органаў МАП па беларускім пытанні вельмі прадузятая», — канстатаваў Міхаіл Орда.

«На ўсе краіны аказваецца беспрэцэдэнтны ціск, каб працягнуць рашэнне супраць Беларусі. Прычым робіць гэта тыя, хто павінен быць бестаронніх. Поўнасцю знішчаны прынцып плюралізму», — дадаў кіраўнік ФПБ.

Ён звярнуў увагу, што агульная пазіцыя Групы працоўных МАП падаецца такім чынам, што нібыта работнікі аднагалосна падтрымліваюць прымяненне абмежавальных мер да Беларусі. «Гэта абсалютна не так. На пасяджэннях Групы працоўных 5 чэрвеня прафсаюзы, якія прадстаўляюць розныя краіны і дзясяткі мільёнаў працоўных, выказаліся катэгарычна супраць такіх мер. Аднак усё гэта цалкам праігнаравана кіраўніцтвам групы. На камітэце па агульных пытаннях аб гэтай пазіцыі не было сказана ні слова! Ідзе поўнае скажэнне і маніпуляцыя фактамі», — падкрэсліў Міхаіл Орда.

Ён указаў на заявы, якія пастаянна гучаць, што нібыта работнікі Беларусі асуджаныя за прафсаюзную дзейнасць і пры гэтым свядомае ўтойванне таго, што іх дзеянні насамрэч не мелі нічога агульнага з прафсаюзнай дзейнасцю і абаронай правоў працоўных. Па гэтым пытанні ў чэрвені на пасяджэнні Групы працоўных МАП Беларусь прасіла прадставіць канкрэтныя факты, але гэтага так і не было зроблена. «Значыць, іх няма, што яшчэ раз пацвярджае, што інфармацыя мае непраўдзівы, скажоны характар», — сказаў кіраўнік ФПБ. У якасці прыкладу ён прывёў сітуацыю з небяспечнымі правакацыямі на адным з прадпрыемстваў Беларусі: «Тыя, каго тут называюць «нявіннымі ахвярамі», каб дабіцца сваіх палітычных мэт, спрабавалі парушыць тэхналагічны працэс на небяспечнай тэхнічнай вытворчасці сваімі правакацыйнымі дзеяннямі, што непасрэдна вяло да тэхнагеннай катастрофы. У выніку магло быць знішчана не толькі прадпрыемства, але і цэлы горад. І гэта дакладны факт». З гэтай нагоды Міхаіл Орда адрасаваў рытарычнае пытанне МАП: ці гатова арганізацыя апраўдваць і заахвочваць такія незаконныя дзеянні ва ўсіх краінах свету?

**Міністр працы і сацыяльнай абароны Беларусі Ірына КАСЦЕВІЧ** у сваім выступленні адзначыла: «Краінам Захаду і асобным прафсаюзным аб'яднанням не патрэбна праўда. Іх задача — апраўдаць свае беззаконныя і несправядлівыя дзеянні па палітычнай ізаляцыі і эканамічнай блакадзе Беларусі. Вельмі шкада, што МАП аказалася ўцягнутая ў гэтую знешнепалітычную гульню».

Разам з тым міністр звярнула ўвагу, што сёння ўсё больш краін разумеюць сутнасць антыбеларускай прапаганды, якую прасоўвае Захад у міжнародных арганізацыях, і выступаюць у падтрымку Беларусі.

Ірына Касцевіч адзначыла, што беларускі бок яшчэ некалькі гадоў таму паспяхова ўзаемадзейнічаў з МАП. Меры, што прымаюцца ўрадам краіны, не раз з цікавасцю адзначалі ў арганізацыі. Дыялог паміж бакамі развіваўся ў пазітыўным рэчышчы. «Так што заявы асобных выступоўцаў, што ўрад сістэматычна не рабіў захадаў, — хлусня. Толькі пасля прэзідэнцкай выбарчай кампаніі 2020 года органы МАП, як па загадзе, змянілі свае ацэнкі, рэзка павысіўшы градус крытыкі», — падкрэсліла Ірына Касцевіч.

Ключавы аргумент для ціску на Беларусь заключаецца ў тым, што асобныя «прафсаюзныя дзеячы прыцягнуты да крымінальнай адказнасці, а іх арганізацыі спынілі работу». «У Беларусі прафсаюзы — гэта значная частка грамадзянскай супольнасці. Прафсаюзныя правы замацаваны ў заканадаўстве і выконваюцца на практыцы. Пры гэтым прафсаюзы павінны заставацца прафсаюзамі, — сказала міністр. — Так, некаторыя грамадзяне сапраўды адбываюць пакаранне. Але гэта ніякім чынам не звязана з прафсаюзнай работай. Яны толькі выкарыстоўвалі статус прафсаюзнай арганізацыі для прыкрыцця дэструктыўнай дзейнасці, накіраванай на змену законнай улады, што не суадносіцца з задачамі, якія павінны вырашаць сапраўдныя прафсаюзы».

Па словах Ірыны Касцевіч, апаненты Беларусі спрабуюць рукамі МАП рэалізаваць сваю мэту — дыскрэдытаваць Беларусь на міжнароднай арэне, узмацніць палітычны ціск на ўладу, запусціць чарговую хвалю санкцый на падставе рашэнняў МАП.

«У мяне два пытанні да лабістаў рэзалюцыі. Першае: хіба прафсаюзны статус дае карт-бланш на парушэнне законаў? І другое: няўжо ізаляцыя Беларусі і ўшчамленне інтарэсаў яе грамадзян — гэта прыдатныя інструменты для дасягнення высокіх мэт, якія стаяць перад МАП? Я ўпэўнена, што ў зале няма ніводнага чалавека, які б не разумеў, што гэта супярэчыць філасофіі МАП і мэтам яе дакументаў. Што гэта негатыўна адаб'ецца на эканамічных і сацыяльных правах усіх беларусаў, найперш уразлівых — дзяцей, інвалідаў і старых», — падкрэсліла міністр.

**Паводле БелТА.**

Адукацыя

# Першы раз у першы клас

## Школы Беларусі пачалі прыём дакументаў у першыя класы

**Прымаць дакументы для залічэння ў першыя класы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі дзяцей, якія жывуць у мікрараёне школы, будуць да 15 жніўня. Пры наяўнасці свабодных месцаў для залічэння першакласнікаў, якія не пражываюць у мікрараёне школы, дакументы могуць быць пададзены з 16 да 28 жніўня, паведамляе БелТА.**

У школу прымуць дзіця, якое дасягнула на пачатак навучальнага года шасці гадоў. Па жаданні аднаго з законных прадстаўнікоў першакласніка могуць залічыць і ў пазнейшым узросце. Таксама па заяве аднаго з бацькоў і пры наяўнасці рашэння педагагічнага савета ў 1-ы клас можа трапіць і пяцігодка, але з умовай, што шэсць яму споўніцца ў бягучым каляндарным годзе.

Бацькі будучага першакласніка павінны падаць у школу заяву на імя дырэктара, пасведчанне аб нараджэнні дзіцяці, даведку аб здароўі, заключэнне ЦКРНіР аб праграме навучання (пры яго наяўнасці).

Залічэнне навучэнцаў у 1-я класы ажыццяўляецца да 31 жніўня.

Больш падрабязная інфармацыя, напрыклад, аб мікрараёне, які адносіцца да школы, парадку прыёму дакументаў у першыя класы, у тым ліку на свабодныя месцы, размешчана на афіцыйных сайтах устаноў адукацыі.

# НОВАМУ ЧАСУ — «АТЛАС БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ»

**Навучальны дапаможнік новага пакалення пад такой назвай распрацавалі ў БДУ. Аўтарам выдання з'яўляецца прафесар кафедры гісторыі Расіі гістарычнага факультэта БДУ Сцяпан Цемушаў. Работа вядзецца ў рамках гранта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне адукацыі на 2023 год. Стварэнне навучальнага дапаможніка абумоўлена неабходнасцю ўсебаковага забеспячэння выкладання вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці».**

Атлас падрыхтаваны з улікам дасягненняў беларускай гістарычнай навукі, былі прыцягнуты новыя крыніцы і архіўныя матэрыялы, а таксама аўтарскія даследаванні ў галіне гістарычнай геаграфіі.

Карты адлюстроўваюць у храналагічнай паслядоўнасці ваенна-палітычныя падзеі і адміністрацыйна-тэрытарыяльныя пераўтварэнні на беларускіх землях, сацыяльна-эканамічнае развіццё нашай дзяржавы.

Дапаможнік складаецца з каля 70 старонак, якія змяшчаюць поўнакаляровыя карты, ілюстрацыі, гістарычныя звесткі і практычныя заданні. Яны структурна размеркаваны па шасці тэматычных раздзелах, якія адпавядаюць гістарычным перыядам ад IV стагоддзя да нашага часу: рассяленне славян на тэрыторыі Беларусі, Полацкае і Тураўскае княствы, Вялікае Княства Літоўскае, Расійская імперыя, Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка і сучасная Рэспубліка Беларусь. У атласе адлюстравана пераемнасць паміж рознымі яе перыядамі.

На дадзены момант электронная версія навучальнага дапаможніка апрабуецца шэрагам рэспубліканскіх ВНУ. Таксама вядзецца сумесная работа з РУП «Белкартаграфія» над выданнем друкаванага варыянта, які ўкараняць у адукацыйны працэс універсітэтаў у 2024/2025 навучальным годзе.

Як нагадалі ў прэс-службе БДУ, з верасня 2022 года ва ўсіх беларускіх ВНУ ўвялі дысцыпліну «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці». Навуковы калектыў на чале з Ігарам Марзалюком падрыхтаваў дапаможнік «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» для забеспячэння выкладчыкаў вучэбна-метадычнай літаратурай. У аўтарскі склад увайшлі таксама пяць супрацоўнікаў БДУ. Гэта дэкан гістарычнага факультэта Аляксандр Каханоўскі, дэкан факультэта сацыякультурных камунікацый Аляксандр Бурачонак, загадчык кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Сяргей Ходзін, прафесар кафедры гісторыі Расіі гістарычнага факультэта Сцяпан Цемушаў, прафесар Пётр Брыгадзін.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Ну і ну!

# Ну які ж ты «сірыйскі ваенны»?

## Мужчына выманіў у беларускі 90 тысяч расійскіх рублёў

**У Цэнтральнае РУУС сталіцы звярнулася 46-гадовая жыхарка Мінскай вобласці, якая стала ахвярай махляроў.**

Пацярпелая распавяла, што ў сацыяльнай сетцы пазнаёмілася з амерыканцам па імені Колінс. Іншаземец расказаў, што цяпер знаходзіцца з ваеннай місіяй у Сірыі. У працэсе перапіскі мужчына прызнаўся жанчыне ў каханні і паведаміў, што хоча з ёй сустрэцца. Як падзеі разгортваліся далей, паведамляе ГУУС Мінгарвыканкама.

Для пацвярджэння сур'ёзнасці сваіх намераў амерыканец адправіў каханай пасылку з каштоўнымі рэчамі. Праз некаторы час з жанчынай звязаліся прадстаўнікі кур'ерскай кампаніі і паведамілі, што з-за неналежна афармленых дакументаў пасылка арыштавана ў Турцыі, у сувязі з чым трэба заплаціць пошліну. Пацярпелая паверыла і пералала звыш 90 тысяч расійскіх рублёў.

Пазней жанчыне паступіла паведамленне ад нібыта мытных органаў аб тым, што пры сканаванні ў пасылцы знойдзена 98 тысяч долараў, і ёй неабходна пералічыць яшчэ 2200 еўра, каб атрымаць бандэроль. Калі пацярпелая адмовілася, ёй прыгразілі, што пасылка будзе канфіскавана, а саму жанчыну прыцягнуць да крымінальнай адказнасці за «адмыванне» грошай. Пасля гэтага пацярпелая звярнулася ў міліцыю.

Распачата крымінальная справа за махлярства.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Надвор'е

# З дажджамі пакуль праблема

## А з сярэдзіны тыдня прыпячэ да 30 градусаў

**Неяк сапсаваўся ў нас чэрвень для дачнікаў. А ўсяму віной — антыцыкланальны характар надвор'я. Ён усталяваўся на тэрыторыі нашай краіны і працягвае ўтрымліваць у большасці раёнаў пераважна сухое надвор'е.**



На гэтым працоўным тыдні тэрыторыя Беларусі працягне знаходзіцца пад пераважным уплывам вобласці павышанага атмасфернага ціску, таму на большай частцы тэрыторыі па-ранейшаму будзе захоўвацца дэфіцыт ападкаў. Толькі ў паўднёвых і паўднёва-заходніх рэгіёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. А 15 і 16 чэрвеня пад уплывам сістэмы атмасферных франтоў, якія ссоўваюцца з Карпат, па паўднёвым захадзе краіны дажджы стануць больш інтэнсіўнымі, у асобных раёнах прагрымяць навальніцы, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Па прагнозах сіноптыкаў, калі ў пачатку тыдня яшчэ будзе рэальна халадна па раніцах, то ў далейшым ночы ў краіне стануць цяплейшыя, а дзённы прагрэў з кожным днём будзе павялічвацца. У аўторак толькі па поўдні краіны месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Днём будзе 17—23 градусы цяпла. У сераду месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 6—13 градусаў вышэй за нуль. Днём будзе 20—27 градусаў, але ў паўднёва-заходніх раёнах краіны ўсяго толькі ад плюс 17 да 19 градусаў цяпла.

Не будзе ападкаў і ў чацвер, толькі па паўднёвым захадзе краіны пройдуць дажджы, часам моцныя, месцамі навальніцы. Нават у цёмны час сутак стане цяплець. Тэмпература паветра ўначы складзе 9—15 градусаў вышэй за нуль. Днём будзе 23—28 цяпла, у паўднёва-заходніх раёнах — 19—22 градусы з плюсам.

У пятніцу пераважна без ападкаў, толькі па паўднёвым захадзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы і моцныя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 9—16 градусаў вышэй за нуль. Днём будзе 23—29 градусаў цяпла, у паўднёва-заходніх раёнах — плюс 18—22 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у выхадныя дні ў краіне стане яшчэ на пару градусаў цяплей. Гэтымі днямі ў дзённыя гадзіны месцамі слупкі тэрмометраў нават пераадолеюць адзнаку ў 30 градусаў, а вось дажджоў па-ранейшаму будзе няшмат і размяркоўвацца па тэрыторыі краіны яны будуць нераўнамерна. Пры такіх спрыяльных умовах тэмпература вады ў рэках і вадаёмах працягне павышацца.

У суботу пераважна па захадзе краіны пройдуць дажджы, месцамі навальніцы і моцныя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 10—17 градусаў вышэй за нуль. Днём ад плюс 18 па захадзе да плюс 30 градусаў па ўсходзе краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Германіі стартавалі найбуйнейшыя ў гісторыі НАТА ваенна-паветраныя вучэнні Air Defender



У паветранай прасторы Германіі пачаліся найбуйнейшыя ў гісторыі НАТА вучэнні Air Defender 23. Пра гэта паведаміла нямецкая газета Die Zeit. Адзначаецца, што да 23 чэрвеня ў вучэннях пад кіраўніцтвам Германіі прымуць удзел 25 краін. Па даных Бундэсвера, будзе задзейнічана каля 10 тысяч салдат і 250 самалётаў. Толькі з Германіі ў вучэннях бяруць удзел больш за 60 самалётаў і верталётаў. Злучаныя Штаты накіравалі ў Германію звыш 100 самалётаў. На сайце ўзброеных сіл Федэратыўнай Рэспублікі Германія адзначаецца, што «вучэнні такога маштабу яшчэ не праводзіліся». Раней стала вядома, што перад авіябазай Вунстарф паблізу Гановера каля 300 чалавек правялі акцыю пратэсту супраць вучэнняў НАТА Air Defender. Да дэманстрацыі заклікалі некалькі арганізацый, якія выступаюць за мір. Дэманстранты неслі плакаты з сімваламі свету. Пратэстоўцы выказалі апасенні, што маштабныя вучэнні ў цэнтры Еўропы ўзмоцняць рознагалоссі і прывядуць да далейшай эскалацыі канфлікту ва Украіне. Таксама, як сцвярджаюць актывісты-эколагі, такія буйныя манеўры шкодныя для клімату.

### Пайшоў з жыцця экс-прэм'ер Італіі Сільвія Берлусконі



Аб гэтым паведаміла выданне Corriere della Sera. У пачатку красавіка палітыка шпіталізавалі з запаленнем лёгкіх, пасля чаго ў яго была дыягнаставана лейкемія. Тады Берлусконі праходзіў курс хіміятэрапіі і правёў у бальніцы больш за месяц. 9 чэрвеня былога прэм'ера зноў шпіталізавалі. 12 чэрвеня стала вядома, што палітык памёр ва ўзросце 86 гадоў. Сільвія Берлусконі нарадзіўся 29 верасня 1936 года ў Мілане. Заснаваўшы ў 1994-м партыю «Наперад, Італія», ён разам з ёй выйграў агульнанацыянальныя парламенцкія выбары. Увогуле Сільвія Берлусконі займаў пасаду кіраўніка ўрада Італіі чатыры разы. У апошнія гады стан здароўя знакамітага палітыка пагоршыўся. У 2016 годзе Берлусконі перанёс аперацыю на сэрцы, у яго таксама быў дыягнаставаны рак прастаты. Пасля заражэння каранавірусам у 2020 годзе ён неаднаразова трапляў у бальніцу.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні родным і блізкім Сільвія Берлусконі ў сувязі з яго смерцю. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Сільвія Берлусконі застанецца ў памяці як чалавек з выключнай харызмай і патрыёт, які садзейнічаў кансалідацыі італьянскага грамадства і ўмацаванню міжнародных пазіцый краіны далёка за яе межамі.**

### Адкрыўся 25-ы Шанхайскі міжнародны кінафестываль



Сёлета ў спіс намінантаў на прэмію «Залаты кубак» увайшлі 53 работы, паведаміла інфармагенцтва «Сіньхуа». На працягу дзевяцідзённага мерапрыемства ў 41 кінатэатры Шанхая будзе паказана каля 450 стужак з Кітая і замежных краін, сярод якіх 53 сусветныя прэм'еры, 41 міжнародная прэм'ера, 80 азіяцкіх прэм'ер і 76 кітайскіх прэм'ер, паведамілі арганізатары. Прэмія «Залаты кубак» гэтага года складаецца з пяці конкурсных катэгорый: поўнаметражныя фільмы, новыя таленты Азіі, дакументальныя фільмы, анімацыйныя фільмы і кароткаметражныя фільмы. Акрамя таго, у рамках кінафестывалю таксама пройдзе шэраг іншых мерапрыемстваў, у тым ліку кінатыдзень «Пояс і шлях». Як вядома, сёлета касавыя зборы ў Кітаі ўжо ў пачатку мая дасягнулі адзнакі ў 20 млрд юаняў, што адбылося раней, чым летась, сведчыць статыстыка платформаў даных аб фільмах Maoyan і Beacon.

# ЗАПАСЫ ЁСЦЬ, АЛЕ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*




**Каля бювета ў санаторыі «Нёман-72».**



**Месца па здабычы вады ў аграгарадку Парэчча.**

У Гродне, напрыклад, дзейнічае толькі адна свідравіна з мінеральнай вадой. Адпаведны бювет у канцы мінулага года ўстаноўлены ў санаторыі «Нёман-72». Бювет — гэта бальнеалагічная прылада водаразборных кранаў для пітнога выкарыстання мінеральных водаў, якая забяспечвае захаванне натуральных хімічных рэчываў. Як правіла, такія павільёны будуюць проста над выхадам крыніцы на паверхню.

— Мы запусцілі бювет у сталовай. Вада мінеральная, прыродная, лячэбна-сталовая, хларыдна-гідракарбанатная, кальцыева-натрыевая, слабамінералізаваная. Яе можна піць без прызначэння — як у лячэбных, так і прафілактычных мэтах, — адзначае **дырэктар санаторыя Леанід АДАМОНІС.**

Па яго словах, аб існаванні свідравіны было вядома даўно. Захаваліся старыя дакументы па даследаванні вады. Іх прааналізавалі і вырашылі абсталяваць бювет. Быў зроблены новы аналіз вады, які пацвердзіў, што гэта сапраўды сталовая вада слабай мінералізацыі. Паколькі свідравіна доўгі час прастойвала, яе прачысцілі і правялі неабходныя камунікацыі, у тым ліку па падагрэваю вады. Каб запусціць бювет, санаторыю спатрэбілася амаль тры гады і вялікая колькасць узгадненняў.

Шлях ад распрацовак да прымянення мінеральнай вады аказаўся працяглы. Комплексныя даследчыя работы па пошуку мінеральных крыніц у Гродзенскім раёне пачаліся яшчэ ў 1990-х гадах і праводзіліся згодна з дзяржаўнай праграмай. Месца для даследаванняў абралі паблізу з літоўскай граніцай, адкуль усяго з дзясятак кіламетраў да вядомага курорта Друскінінкай. Падчас работ даследавалі 26 свідравін на працягу амаль дзесяці кіламетраў. Палова іх абсталявана фундаментам. Ваду з гэтых крыніц адправілі ў маскоўскую лабараторыю, дзе пацвердзілі мінеральны склад. Але ў хуткім часе работы былі спынены, а свідравіны закансерваваны. **Старшыня грамадскага аб'яднання «Прынямонне» Тэрэза БЕЛАВУСАВА** расказала, што вада з тых свідравін цякла проста на поле, мясцовыя жыхары хадзілі па яе. Сюды таксама ішлі каровы, якіх прывабліваў салёны раствор.

**«Пакуль толькі трэцяя частка беларускіх санаторыяў мае ўласную мінеральную ваду. Большасць з іх знаходзіцца ў Гомельскай вобласці, дзе запасы мінеральнай вады больш значныя. Увогуле краіна багатая гэтым прыродным рэсурсам. Па словах спецыялістаў, у Беларусі ёсць вада рознага ўзроўню салёнасці і складу. У Гродзенскай вобласці, напрыклад, ёсць унікальная радонавая вада».**

Пазней даследаванні працягнулі беларускія геолагі. «Прынямонне» цесна супрацоўнічае з Інстытутам прыродакарыстання НАН Беларусі. Для Тэрэзы Белавусавай, ураджэнкі прыгранічча, вельмі важна выявіць прыродныя багацці гэтага краю. Яна расказала, што яе дзядзька, які жыў у Друскінінкаі, быў сведкам пошуку там мінеральных крыніц. Пазней такая работа праводзілася і ў Беларусі. У ходзе гэтых распрацовак з'явілася свідравіна паблізу санаторыя «Парэчча» Гродзенскага раёна. Вада там паступае з глыбіні амаль паўкіламетра. Па сваім складзе яна адпавядае друскінінкайскай, якая вядомая сваімі карыснымі якасцямі больш за 200 гадоў. Вада паступае не толькі ў санаторый, але і на вытворчую лінію па яе разліве. Час ад часу яна з'яўляецца ў продажы. Але гэта вельмі невялікі ўчастак работы па асваенні мінеральных крыніц, лічыць Белавусава. У яе захоўваецца нямала дакументаў, якія сведчаць аб даследаваннях самой тэрыторыі, а таксама лабараторныя аналізы вады. Работа працягваецца, кажа яна, але вельмі марудна.

— Як бачым на прыкладзе санаторыя «Нёман-72», свідравіна доўгі час была закансерваваная, але ўрэшце пачала дзейнічаць. А такіх гатовых свідравін больш за два дзясяткі, яны даследаваны, па кожнай ёсць станоўчыя заключэнні. Прычым некаторыя маюць розную ступень мінералізацыі. Трэба выкарыстоўваць наша прыроднае багацце, — упэўнена грамадская актывістка. — Магчыма, варта ўзяць удзел у абласным конкурсе грамадзянскіх ініцыятыў і атрымаць грант, каб устанавіць лінію па разліве мінеральнай вады.

**«Як бачым на прыкладзе санаторыя «Нёман-72», свідравіна доўгі час была закансерваваная, але ўрэшце пачала дзейнічаць. А такіх гатовых свідравін больш за два дзясяткі, яны даследаваны, па кожнай ёсць станоўчыя заключэнні. Прычым некаторыя маюць розную ступень мінералізацыі. Трэба выкарыстоўваць наша прыроднае багацце».**

Дырэктар санаторыя дадае: ваду можна ўстанаўліваць у пластыкавых бутлях на прадпрыемствах і ўстановах 3-4 разы ў год. Станоўчым эфектам будзе аздараўленне, умацаванне імунітэту работнікаў. Для рэалізацыі ідэі патрэбная абласная праграма. Магчыма, тут патрабуецца і ўдзел дэпутатаў.

Аб уладкаванні бювета задумаліся ў гродзенскім санаторыі «Жамчужына». Як патлумачылі ў аздараўленчай установе, наяўнасць прыродных фактараў мае вялікае значэнне падчас атэстацыі любой санаторна-курортнай арганізацыі. А мінеральная вада — адзін з такіх. Таму ў санаторыі мяркуюць аднаўляць свідравіну для здабычы вады, хоць гэта і патрабуе выдаткаў.

Пакуль толькі трэцяя частка беларускіх санаторыяў мае ўласную мінеральную ваду. Большасць з іх знаходзіцца ў Гомельскай вобласці, дзе запасы мінеральнай вады больш значныя. Увогуле краіна багатая гэтым прыродным рэсурсам. Па словах спецыялістаў, у Беларусі ёсць вада рознага ўзроўню салёнасці і складу. У Гродзенскай вобласці, напрыклад, ёсць унікальная радонавая вада.

— Каштоўнасць мінеральнай і радонавай вады на Гродзеншчыне відавочная, — пацвердзіў **вядучы супрацоўнік Інстытута прыродакарыстання НАН Беларусі Васіль ПАШКЕВІЧ.** — І хоць запасы вады тут не такія вялікія, як, напрыклад, у іншых рэгіёнах Беларусі, затое яны маюць сваю адметнасць. Той жа аналаг вады літоўскага курорта Друскінінкай. Толькі дзякуючы вадзе горад набыў сусветную вядомасць, там пабудаваны дзясятак аздараўленчых баз. Менавіта такая вада здабываецца ў нашых прыгранічных санаторыях.

Па словах навукоўца, якасны склад вады даследаваны, атрыманы ўсе неабходныя заключэнні. Цяпер справа за тым, каб дадзены рэсурс працаваў. Якім чынам? Гэта павінны вырашаць уладныя структуры і інвестары. Прыродныя запасы могуць стаць больш даступнымі для шырокага кола насельніцтва. Дарэчы, не толькі вада, але і іншыя віды прыроднай медыцыны. Напрыклад сапрапелевыя гразі. Тэрэза Белавусава не адзін год «прабівае» тэму здабычы сапрапелевых выкапняў паблізу Гродна, дзе б'юць чыстыя крыніцы, якія абмываюць сапрапелі. «Нам трэба думаць пра аздараўленне, удасканальваць заканадаўчую базу, зацікаўліваць мясцовыя ўлады», — падсумоўвае яна.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

Бяспека

# «Расатам» распрацуе канцэпцыю вываду БелАЭС з эксплуатацыі



**Увод у эксплуатацыю другога энергаблока АЭС, запланаваны на восень 2023-га, стане завяршэннем праекта будаўніцтва Беларускай АЭС. Адпаведна з заканадаўствам, на працягу года з дня ўводу ў эксплуатацыю атамнай электрастанцыі арганізацыя, якая яе эксплуатуе, то-бок прадпрыемства «Беларуская АЭС», павінна разлічыць кошт комплексу мерапрыемстваў па вывадзе з эксплуатацыі АЭС. Каб атрымаць абгрунтаваны кошт, будзе распрацавана канцэпцыя вываду з эксплуатацыі энергаблокаў станцыі, і дапаможа зрабіць тое таварыства «ЦВЭЛ», інтэгратар Дзяржкарпарацыі «Расатам» па вывадзе з эксплуатацыі ядзерна- і радыяцыйна небяспечных аб'ектаў і абыходжанні з радыеактыўнымі адходамі.**

Кампанія пракансультуе Беларусь па пытаннях падрыхтоўкі і вываду з эксплуатацыі энергаблокаў станцыі, у тым ліку стварыць метадычную аснову кіравання коштам вываду з эксплуатацыі энергаблокаў БелАЭС. Адпаведны дагавор на навукова-тэхнічнае суправаджэнне БелАЭС па пытаннях падрыхтоўкі і вываду з эксплуатацыі энергаблокаў станцыі англійскай падпісала з прадпрыемствам «Беларуская атамная электрастанцыя».

— У рамках умацавання супрацоўніцтва з Беларуссю «Расатам» акажа ўсебаковую падтрымку і прапануе бяспечны, эфектыўны і эканамічна прымальны падыход да вываду з эксплуатацыі энергаблокаў АЭС і абыходжання з радыеактыўнымі адходамі (РАА), — падкрэсліў **Эдуард НІКІЦІН, дырэктар праграм па вывадзе з эксплуатацыі таварыства «ЦВЭЛ»**. — Мы маем вялікі вопыт, партфель тэхналагічных рашэнняў у галіне завяршальнай стадыі ядзернага паліўнага цыкла, ліквідацыі аб'ектаў ядзернай спадчыны, а таксама па абыходжанні з РАА, у тым ліку іх фінальнай ізаляцыі.

Канцэпцыя будзе ўтрымліваць апісанне магчымых варыянтаў вываду з эксплуатацыі энергаблокаў станцыі, у тым ліку выбар і абгрунтаванне аптымальнага варыянта, дзе будуць прадстаўлены асноўныя мерапрыемствы па забеспячэнні бяспекі вываду з эксплуатацыі; пералік сістэм і абсталявання, якія спатрэбяцца для выканання гэтых работ; прапановы і рэкамендацыі па дэмантажы і дэзактывацыі абсталявання і канструкцый; ацэнка агульнай колькасці, віду, катэгорый радыеактыўных адходаў, якія ствараюцца пры вывадзе з эксплуатацыі; інфармацыя па іншых параметрах, важных для планавання вываду з эксплуатацыі.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

Разумныя грошы

# Мяняем «мінус» на «плюс»

## Як выкарыстоўваць шкодныя фінансавыя звычкі для павышэння свайго дабрабыту?

**Што перашкаджае чалавеку жыць па сродках і рабіць накапленні? Вы скажаце, недастаткова высокая зарплата, або высокія цэны, або і тое, і другое. Насамрэч, гэта далёка не заўсёды так. Бо нярэдка чалавек за некалькі дзён да зарплаты аказваецца «на нулі», нават маючы ў параўнанні з суседзямі, калегамі, сябрамі досыць высокі даход. І, здараецца, пазычае «да палучкі» ў тых, у каго даход меншы. Знаёмая сітуацыя? Прычына таму — нерацыянальнае абыходжанне з грашыма, або так званыя дрэнныя фінансавыя звычкі — часта яшчэ з дзяцінства. Змагацца з імі складана, але можна. Пра тое, як змяніць іх, мы спыталі ў саветніка аддзела фінансавай адукаванасці ўпраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка Надзеі ГОДЭС.**

***— Псіхолагі кажуць, што нашы слабасці і дрэнныя звычкі — гэта адваротны бок нашых станоўчых якасцяў і моцных бакоў. Ці можна сказаць тое ж самае аб дрэнных фінансавых звычках — напрыклад, схільнасці да неразумных пакупак або няўменні жыць па сродках?***

— Шмат у чым можна пагадзіцца: дрэнныя звычкі, у тым ліку фінансавыя — адваротны бок нашых вартасцяў. Напрыклад, да імпульсіўных пакупак нас можа схіляць уменне заўважаць і шанаваць прыгажосць, унутраны артыстызм, а схільнасць да транжырства ў характары чалавека часта спалучаецца з гасціннасцю, гатоўнасцю дапамагчы блізкім (у тым ліку фінансава) і іншымі станоўчымі асаблівасцямі характару. Такіх людзей у народзе называюць «чалавек шырокай душы»... Аднак падобныя звычкі могуць адбіцца на вашых асабістых фінансах не найлепшым чынам. Добрая навіна ў тым, што нашы слабасці можна ператвараць у сілу, і калі казаць менавіта аб фінансавых звычках, кожны можа паспяхова зберагаць і накапляць. Важна захацець, і, зразумела, прыкласці намаганні... Вынік, вядома, вас узрадуе.

***— Найбольш частая дрэнная фінансавая звычка ў сучасным свеце — гэта, напэўна, спантанныя пакупкі, якія могуць прабіць велізарны пралом у бюджэце сям'і. Чаму чалавек схільны да імпульсіўных пакупак, пакінем за дужкамі, гэта пытанне да псіхолагаў. Але ці можна змяніць згаданую звычку так, каб яе знак з «мінуса» памяняўся на «плюс»?***

— Вядома, што існуе так званы цыкл звычкі. Ён складаецца з трох элементаў: сігнал (трыгер), распарадак (здзяйсненне дзеяння) і ўзнагарода (станоўчая эмоцыя). У шапаголікаў, як правіла, трыгерам выступае стрэс або нуда. Чалавек здзяйсняе імпульсіўную куплю і атрымлівае станоўчую эмоцыю ў якасці ўзнагароды. Але радасць доўжыцца кароткі час, а потым чалавек пачынае вінаваціць сябе ў марнаванні сродкаў. Спрацоўвае чарговы трыгер, і ўсё паўтараецца.

Адзін са спосабаў разарваць гэтае заганнае кола — выдаліць з цыкла этап узнагароджання. Завядзіце правіла: за кожную імпульсіўную пакупку назначце самому сабе штраф — напрыклад у памеры выдаткаванай сумы. Штраф вы адправіце ў накапленні і такім чынам дасягнеце дзвюх мэт — па-першае, скароціце колькасць імпульсіўных пакупак (бо суму на цэннiку вы ў галаве з часам аўтаматычна прывыкнеце памнажаць на два) і памножыце свае зберажэнні, якія створаць падушку фінансавай бяспекі і дапамогуць адчуваць сябе больш упэўнена ў выпадку непрадбачаных сітуацый — напрыклад, страты работы, хваробы каго-небудзь з блізкіх або паломкі дарагой бытавой тэхнікі.

### РОБІМ НАКАПЛЕННІ

***— Яшчэ адна дрэнная звычка — няўменне даводзіць пачатае да канца. У кіраванні асабістымі фінансамі часта сустракаецца сітуацыя, калі чалавек пачынае збіраць на нешта буйное, але, сабраўшы некаторую суму, адчувае выгаранне і не ў сілах працягнуць адкладваць. А накопленыя грошы ён проста траціць. Далей — альбо крэдыт, альбо адмова ад куплі. Што рабіць з гэтым?***

— Тут дапаможа дакладнае планаванне. Калі ў вас ёсць праграма дзеянняў і вы бачыце канчатковую мэту і тое, што яна дасягальная ў пэўныя тэрміны, рабіць накапленні лягчэй. Патрэбную суму трэба разбіць на этапы (напрыклад, кожны этап — месяц) і ўстанавіць для кожнага этапу выразную (і пасільную) суму, якую варта адкласці.

А каб пазбегнуць выгарання, ёсць хітрасць: пасля 4-5 плацежных перыядаў устанавіце сабе «канікулы» і адзін перыяд не адкладвайце ў накапленні. Абавязкова адлюструйце «канікулы» ў плане. Гэтаксама, як людзі, якія адпачылі падчас працоўнага водпуску, вяртаюцца да работы, так і вы пасля «плацежных канікулаў» з лёгкасцю працягнеце пачатую справу.

***— Аб крэдытах размова асобная. Ёсць і такая дрэнная фінансавая звычка — браць крэдыты на пакупкі, якія насамрэч не такія і неабходныя...***

— Так, крэдыты могуць быць як «дрэннымі», так і «добрымі» — але другі варыянт магчымы, толькі калі правільна ацаніць неабходнасць крэдыту. Бо крэдыт — не падарунак, вам прыйдзецца рабіць выплаты штомесяц, і ў канчатковым выніку пакупка абыдзецца вам даражэй, чым калі б вы назбіралі патрэбную суму. Што тут параіць? У ідэале, лепш аддаць перавагу накапленню сродкаў на пакупку. Як той казаў, глядзіце вышэй: пішам дакладны план з канкрэтна пазначанай датай дасягнення канчатковай мэты (буйной пакупкі) і прытрымліваемся яго. Часам не збіцца з дарогі дапамагае агучванне сваёй мэты — жаданне накапіць за пэўны тэрмін на пэўную пакупку. Расказаўшы блізкім і сябрам пра сваё рашэнне, вы ўжо не можаце дазволіць сабе кінуць усё на паўдарозе. А ў цэлым, крэдыт можа стаць вельмі карысным фінансавым інструментам, а не крыніцай праблем, калі падысці да пытання разумна.




Дрэннай фінансавай звычкай крэдыт становіцца толькі тады, калі ён павялічвае вашы выдаткі, не павялічваючы актывы. Добрым, карысным і разумным будзе той крэдыт, які ўзяты на пакупку, здольную павялічыць ваш даход — на набыццё абсталявання для заробку, на вучобу або павышэнне кваліфікацыі. Зразумела, са знакам «плюс» можна ацэньваць і крэдыт на машыну або кватэру, калі ў іх сям'я востра мае патрэбу — бо гэтымі выгодамі вы пачняце карыстацца адразу ж.

Але вось крэдыты, напрыклад, на навейшую мадэль тэлефона і нейкія імгненныя «хацелкі» небяспечныя. Калі вы бераце крэдыты, кіруючыся жаданнем выглядаць багацейшымі, чым вы ёсць на самай справе, — гэта дрэнная фінансавая звычка. Самая першая парада, вядома ж, — адкладзіце куплю на некаторы час і падумайце, наколькі яна вам патрэбная.

А ёсць і хітрасць: паспрабуйце на працягу двух месяцаў адкладваць сумы, роўныя штомесячным плацяжам па крэдыце, які вы плануеце ўзяць, — магчыма, адчуўшы нагрузку, якая ляжа на ваш бюджэт, вы перадумаеце, а магчыма, убачыце, што вы ў сілах набіраць неабходную суму, і пахваліце сябе за тое, што адмовіліся ад непатрэбнага крэдыту.

### ВЫКЛІК САМОМУ САБЕ

***— Залішняя азартнасць таксама можа стаць дрэннай фінансавай звычкай. Ці можна паставіць азарт на службу асабістай фінансавай стабільнасці, дабрабыту сям'і?***

— Якраз азартнасць — такая якасць, якую лёгка паставіць на службу асабістаму фінансаваму дабрабыту. Важна толькі накіраваць яе ў правільнае рэчышча. Кіньце выклік сабе. Вызначце тэрмін і перыяды накаплення (дзень, тыдзень, месяц) і кожны перыяд «павышайце стаўкі» (на фіксаваную велічыню і каэфіцыент). Стаўка будзе пастаянна павышацца, азарт — працаваць на фінансавы дабрабыт, а ўзнагародай стане тая самая асабістая фінансавая бяспека, якая неабходная кожнаму.

***— Большасць дрэнных фінансавых звычак належыць да разраду «залішняя і/або нематываваная трата грошай». Але ёсць і адваротны варыянт — калі чалавек шкадуе грошай на самога сябе, на свае патрэбы і задавальненні. Што вы параіце ў гэтым выпадку?***

— Як правіла, гэта перфекцыяністы, і сэнс жыцця для іх — у ідэальным выкананні сваіх абавязкаў як на рабоце, так і дома. Для іх важная знешняя ацэнка іх дзеянняў. Значыць, і гаварыць з самім сабой такому чалавеку трэба на зразумелай мове. За любое значнае дасягненне прызначайце сабе «прэмію», за недасягнутыя мэты — выпісвайце «штраф». «Прэмія» траціцца на свае жаданні і патрэбы. «Штраф» — уносіцца ў накапленні. Гуляючы з самімі сабой у такую гульню, вы пазбегнеце выгарання на рабоце і здолееце выдаткоўваць на сябе грошы без адчування віны. Ды і рухацца да пастаўленых прафесійных і кар'ерных мэт стане спакайней і цікавей.

***— І яшчэ адна дрэнная звычка, якую таксама цалкам можна аднесці да фінансавых. Гэта звычка задавольвацца работай, што не прыносіць радасці, і невысокай заробтнай платай, таму што гэта дае магчымасць не выходзіць з зоны камфорту...***

— Сапраўды, такое бывае: чалавек аддае перавагу таму, каб задавальняцца малым, замест таго каб павышаць кваліфікацыю або атрымліваць новую прафесію. І аргументуе гэта для сябе тым, што «я ў сваёй сферы ведаю ўсё», «да дому блізка» або «калектыў добры». А таксама «я не змагу» і «няхай вучыцца хто-небудзь маладзейшы...». У гэтым выпадку таксама дапаможа сістэма «прэмій» і «штрафаў» самім сабе. Прайшлі навучальны курс, атрымалі сертыфікат — можаце выдаткаваць на сябе «прэмію». Адмовіліся ад магчымасці ўдасканальваць свае навыкі, што з'явіліся, — назначце сабе «штраф» (ён па традыцыі, што ўжо склалася, адпраўляецца ў скарбонку). Вы ў любым выпадку будзеце ў плюсе!

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Нерухомасць

# Прадаецца дом графа Патоцкага...

## А яшчэ лазня і бібліятэка

**«Мінскаблмаёмасць» у чэрвені выставіць на электронныя таргі больш як 20 аб'ектаў нерухомай маёмасці камунальнай уласнасці, якія не выкарыстоўваюцца, паведамілі БелТА ў камітэце.**

Пачатковы кошт продажу на многія збудаванні зніжаны, у тым ліку да памеру адной базавай велічыні. Аўкцыёны запланаваны на 14, 15, 21, 27, 28 чэрвеня.

Пакупнікам прапануюць былыя будынкі лазняў, сельскіх Дамоў культуры, бібліятэк, дзіцячых садкоў і школ у населеных пунктах Бярэзінскага, Барысаўскага, Лагойскага, Пухавіцкага, Стаўбцоўскага, Слуцкага, Дзяржынскага, Мінскага, Вілейскага раёнаў.

У вёсцы Камарова Мядзельскага раёна будуць шукаць новага ўласніка для корпуса бытавога абслугоўвання, у Валожыне і Уздзе — для будынкаў дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы і раённай дзіцячай бібліятэкі.

Таксама на чэрвеньскія таргі выстаўлены гасцінічны дом у в. Абрамы Мядзельскага раёна, сядзібны дом графа Патоцкага ў Беразіно, гандлёвы павільён ва Уздзе.

У прыватнасці, сядзібу Патоцкага, пабудаваную ў 1858 годзе, у вобласці ўжо не раз спрабавалі прадаць, але пакуль жадаючых набыць помнік архітэктуры не знайшлося. Яго дазволена трансфармаваць у турыстычны ці спартыўны аб'ект, а таксама ў жылую пабудову. Пачатковы кошт продажу Br28,4 тысячы.

Падрабязная інфармацыя размешчана на сайтах Дзяржкаммаёмасці, Мінскага аблвыканкама, камітэта «Мінскаблмаёмасць».

Сацыяльны вектар

# СЯМЕЙНЫ КАПІТАЛ — НА ЖЫЛЛЁ

**Па праграме «Сямейны капітал» для шматдзетных сем'яў на 1 чэрвеня адкрыта 126 922 дэпазітныя рахункі, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.**

На пачатак чэрвеня адкрыта 82,6 тысячы дэпазітных рахункаў на суму $826 млн і 44,3 тысячы — на суму Br1,08 млрд. Датэрмінова выкарыстоўваць сродкі сямейнага капіталу пажадалі 71 411 заяўнікаў. Пераважная большасць з іх накіруе грошы на паляпшэнне жыллёвых умоў, на медпаслугі патрацяцца 7231 заяўнік, на адукацыю — 4708, на набыццё тавараў для інвалідаў — пяць.

У Мінпрацы нагадалі, што назначаецца сямейны капітал шматдзетным сем'ям пасля нараджэння (усынаўлення або ўдачарэння) трэцяга або наступнага дзіцяці. Пры гэтым памер сямейнага капіталу на дзяцей, якія нарадзіліся (усыноўлены, удачароных), з 1 студзеня да 31 снежня 2023 года, складае Br29 950.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Гомельдрев», г. Гомель, ул. Достоевского, 3. УНП 400021353 |

**Предмет аукциона**
Месторасположение**:**
**Гомельская обл., г. Гомель, пер. Севастопольский 1-й, 53**

**<u>Объекты недвижимости</u> (одним лотом) в составе:**
**здание механизированной мойки** (инв. № 350/С-163612, 127,3 кв. м, составные части: пристройка, смот. яма, очист. сооружения), **КПП стоянки автотранспорта** (инв. № 350/С-163639, 53,2 кв. м), **навес со смотр. ямой (мехмойка)** (инв. № 350/С-163641, 76 кв. м), **очистные замазуч. и ливневых вод** (инв. № 350/С-170152, составные части: закрытый горизонт. отстойник), **дорожное покрытие** (инв. № 350/С-170155), **забор** (инв. № 350/С-170153, 386 м, составные части: 4 ограждения, ворота), **тепловая сеть** (инв. № 350/С-163618, 148,9 м, составные части: каналы, 2 опоры, камера, колодец), **производ. водопровод** (инв. № 350/С-163611, 213,3 м, составные части: 2 трубопровода напорных, колодец, камера (2 шт.), **дожд. канализация** (инв. № 350/С-163609, 234,3 м, составные части: 4 трубопровода безнапорных, колодец, камера (13 шт.), дождеприёмник, **гидроциклон ГЦ-15** (инв. № 3714), **устройства скребковые** (инв. № 3926, 3927).
***Сведения о земельном участке***: предоставлен Продавцу общ. пл. **0,8989** га на праве постоянного пользования для размещения объектов неустановленного назначения.
Ограничения – водоохранная зона водных объектов

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 688 432,48 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15 рабочих дней** после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** рабочих дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте Организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 17.07.2023 в 13.00**
по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703.
Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 14.07.2023 до 17.00** по указанному адресу

**Тел.: +375 17 280-36-37; +375 44 704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие**
**«Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
**(организатор аукциона)**
**по поручению открытого акционерного общества**
**«Виктория-Агро» (продавец)**
**проводит повторный открытый аукцион**
**по продаже имущества в составе:**

**<u>Лот № 1:</u> бригадный дом, инв. № 644/С-61026 общей площадью 97,4 кв.м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625083000001000010 площадью 0,0417 га** *(право постоянного пользования)*, **по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Октябрьский с/с, 8, р-н д. Салогощ.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей, пл. 0,0044 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 8 278,16** бел. руб.

*Начальная цена снижена на 30 %.*

Задаток 10 % от начальной цены – **827,00** бел. руб.

**<u>Лот № 2:</u> склад для хранения грубых кормов, инв. № 644/С-61030 общей площадью 1585 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625083000001000015 площадью 0,4510 га** *(право постоянного пользования)*, **по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Октябрьский с/с, 12, р-н д. Салогощ.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей, пл. 0,0478 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 55 486,03** бел. руб.

*Начальная цена снижена на 30 %.*

Задаток 10 % от начальной цены – **5 548,00** бел. руб.

**<u>Лот № 3:</u> весовая** *(составные части и принадлежности: навес)*, **инв. № 644/С-61032 общей площадью 6,9 кв. м, расположенная на земельном участке с кадастровым номером 625083000001000016 площадью 0,0379 га** *(право постоянного пользования)*, **по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Октябрьский с/с, 14, р-н д. Салогощ.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 12 752,84** бел. руб.

*Начальная цена снижена на 30 %.*

Задаток 10 % от начальной цены – **1 275,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB301210826 00169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

<u>Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в следующем размере: по лоту № 1 – 7 (семи) процентов, по лоту № 2 – 4 (четырех) процентов, по лоту № 3 – 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.</u>

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте Организатора торгов: www.rlt.by. Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 08.06.2022, 02.09.2022.

Аукцион состоится **06.07.2023** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.07.2023** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра 8 (029) 766-51-01.**

УНП 600072178

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Буда-Кошелевский КБО»** (УНН 400035136) 247355, Гомельская обл., г. Буда-Кошелево, ул. Головачева, 10, тел./факс: +375 232 31-59-72 / 25-26-63, тел. +375 29 135-78-72.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **14 июля 2023 г. с 09.00 до 16.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

Предмет торгов –

### ИМУЩЕСТВЕННЫЙ КОМПЛЕКС:

1. изолированное помещение с инв. № 321/D-5300 общей площадью 28,1 кв. м, наименование: изолированное помещение № 10, назначение: помещение бытового обслуживания населения, расположенное по адресу: Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Головачёва П.Я., 10-10. 2. Изолированное помещение с инв. № 321/D-5301 общей площадью 84,2 кв. м, наименование: изолированное помещение № 11, назначение: помещение бытового обслуживания населения, расположенное по адресу: Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Головачёва П.Я., 10-11. 3. Изолированное помещение с инв. № 321/D-5302 общей площадью 71,3 кв. м, наименование: изолированное помещение № 12, назначение: помещение бытового обслуживания населения, расположенное по адресу: Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Головачёва П.Я., 10-12. 4. Изолированное помещение с инв. № 321/D-5300 общей площадью 403,5 кв. м, наименование: изолированное помещение № 13, назначение: помещение бытового обслуживания населения, расположенное по адресу: Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Головачёва П.Я., 10-13. 5. Забор металлический с калиткой, инв. № б/н. 6. Водопровод, инв. № б/н. 7. Тепловая сеть, инв. № б/н. 8. Оборудование: 8.1. сушуар, инв. № 509; 8.2. сушуар, инв. № 581; 8.3. рабочее место приемщика, инв. № 550; 8.4. рабочее место приемщика, инв. № 501; 8.5. рабочее место приемщика, инв. № б/н; 8.6. рабочее место приемщика, инв. № б/н; 8.7. комплект оборудования рабочего места обувщика инв. № б/н; 8.8. кресло с гидроподъемником, инв. № 00369 (нераб.); 8.9. комплект оборудования для организации рабочего места по оказанию парикмахерских услуг, инв. № 502; 8.10. комплект оборудования для организации рабочего места по оказанию парикмахерских услуг, инв. № б/н; 8.11. стеллаж торговый, инв. № б/н (5 шт.); 8.12. оборудование для организации рабочего места по оказанию парикмахерских услуг, инв. № б/н (2 шт.); 8.13. петельная машина 25 кл. Minerva 19724, инв. № 00018; 8.14. сейф металлический, инв. № б/н (5 шт.); 8.15. стиральная машина автомат «Атлант», инв. № 00360 (нераб.); 8.16. стиральная машина автомат «Атлант», инв. № 00361 (нераб.); 8.17. стиральная машина автомат «Атлант», инв. № 00363 (нераб.); 8.18. стиральная машина автомат «Атлант», инв. № 00364 (нераб.); 8.19. швейная машина 22 кл., инв. № 849 (м/лом); 8.20. швейная машина 22 кл., инв. № 837 (м/лом); 8.21. швейная машина 22 кл., инв. № 517 (м/лом).

Кадастровый номер земельного участка, на котором расположены объекты недвижимости – 320550100001000723 (7/10 доли в праве аренды). Обременение по изолированным помещениям – договоры аренды помещений, крыши; по зданию – договор электроснабжения.

Начальная цена предмета торгов – 382 288,00 бел. руб. с НДС.

Телефон для ознакомления и осмотра +375 29 135-78-72.

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 14.06.2023 г. с 09.00 по 13.07.2023 г. до 16.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и оплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор**: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375212 24-63-12, +37529 510-07-63.

**Продавец:** гражданин Республики Беларусь Сивак Василий Васильевич, тел. +375 29 109-34-55.

**Лот № 1.** Капитальное строение с инв. № 200/U-501923 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Минская, 26, наименование – незавершенное законсервированное капитальное строение, назначение – здание неустановленного назначения (готовность – 4 %), находящееся на зем. участке с кадастровым № 240100000001014474 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Янопольская, площадью 0,5675 га, целевое назначения зем. участка – для строительства объекта «Логистический центр в районе улицы Янопольской в г. Витебске» (право аренды сроком по 16.03.2046), назначение – земельный участок для размещения объектов иного назначения. Ограничения: участок расположен в зоне санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора.

**Нач. цена: 63 200,00 бел. руб. Задаток: 6320,00 бел. руб.**

**Дата, время и место проведения аукциона: 17.07.2023 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 14.06.2023 с 08.30 по 16.07.2023 до 17.30. **Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901.** Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**<u>Условия аукциона</u>**: Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 раб. дней со дня утверждения протокола аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона; оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. **Аукцион проводится в порядке, установленном Указом Президента Республики Беларусь № 232 от 05.05.2009 г. «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)», ст. 417-419 Гражданского кодекса Республики Беларусь.** Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивид. предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивид. предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский языки; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивид. предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский языки. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона.

**Доп. информацию можно получить по тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 29 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by**. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 29 109-34-55.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | УП «НАЦИОНАЛЬНЫЕ СПОРТИВНЫЕ ЛОТЕРЕИ», г. Минск, пр-т Независимости, 49, пом. 25, +375 29 607 75 72 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов: право заключения договора аренды недвижимого имущества**

| Наименование недвижимого имущества | Размер арендной платы за месяц | Начальная цена / сумма задатка | Шаг торгов |
|---|---|---|---|
| **Административное помещение (Административное помещение)** с инвентарным № 300/D-6616, общ. пл. 150,0 кв. м, по адресу: г. Гомель, пер. Островского 2-й, д. 1. **Срок аренды – 3 года** | **1 597,05 бел. руб.** | **633,75 бел. руб.** | **31,69 бел. руб.** |

**Задаток** для участия в электронных торгах перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Дата и время начала и окончания электронных торгов:**
**с 11.00 до 11.10 14.07.2023**.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by **по 13.07.2023 до 17.00**

**Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу (au.nca.by) 13.06.2023 г.**

**Контактные телефоны**: +375 (17) 280-36-37; +375 (44) 704-92-06.
**E-mail:** auction@cpo.by

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Лоевский КБО»** (УНН 400028996), 247095, Гомельская обл., г. п. Лоев, ул. Ленина, 24а, Тел./факс: +375 232 31-59-72 / 25-26-63, тел. +375 29 135-78-72

Публичные торги в электронной форме будут проведены **14 июля 2023 г. с 09.00 до 16.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Кресло парикмахера (инв. № 2305), 2006 г. в.; сушуар BS-007 (инв. № 2318), 2008 г. в. | 30,00 |
| 2 | Гладильный каток (инв. № 2309), 2007 г. в. | 22,00 |
| 3 | Форма метал. кольца КС-10,9 (инв. №№ 2552, 2553, 2554), 2013 г. в. (3 ед., некомплект) | 132,00 |
| 4 | Изолированное помещение с инв. № 340/D-2118475 общей площадью 63,3 кв. м, наименование: изолированное помещение № 2, назначение: торговое помещение, расположенное по адресу: Гомельская обл., Лоевский р-н, Колпенский с/с, ул. Советская, 23А-2. Кадастровый номер земельного участка, на котором расположено изолированное помещение – 323081205601000101 (61/100 доли в праве постоянного пользования) | 6600,00 |

**Местонахождение – г. Гомель, ул. Б. Хмельницкого, 77.**
**Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.**

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 14.06.2023 г. 09.00 по 13.07.2023 г. 16.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 календарных дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и оплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 10.05.2023 г.

## Брестский филиал РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» извещает о проведении открытого аукциона

**Лот:** капитальное строение с инвентарным номером 100/U-90491 (наименование: незавершенное законсервированное капитальное строение; назначение: здание неустановленного назначения), площадью 2754,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Знаменский с/с, 120/18, на земельном участке с кадастровым номером 121280800001000025, площадью 0,2478 га

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (без учета НДС)** | 63 500,00 | **Размер задатка, руб.** | 6 350,00 |

**Продавец:** ОАО «СКО «Брестагроздравница», Брестская обл., Брестский р-н, район п. Берестье, тел./ф. 80162 94 13 34. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./ф. 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенного договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 18 июля 2023 г. в 11.00**
**по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона: www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**
**Последний день приема заявлений – 17 июля 2023 г. до 17.00**

# Лета без «прыгод»

## Як пажылым людзям пераЖыць гарачую пару года



Лета ў бабулі і дзядулі — наша нацыянальная традыцыя.

**Высокія тэмпературы паветра наш арганізм успрымае як моцную нагрузку, і, калі дзесьці ў ім ёсць непаладкі, стабільны «+» на тэрмометры можа справакаваць сур'ёзныя праблемы са здароўем. У першую чаргу гэта датычыцца пажылых людзей — тых, каму за 60, 70, 80... Як перажыць лета ў добрым здароўі, мы спыталі ў кіраўніка Рэспубліканскага геранталагічнага цэнтра, галоўнага герыятра Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Людмілы ЖЫЛЕВІЧ.**

У спякоту за дзень чалавек можа страціць з потам каля 2 літраў вадкасці, разам з якой сыходзяць важныя мікраэлементы, неабходныя для работы сардэчна-сасудзістай сістэмы, іншых органаў. Малады арганізм здольны адаптавацца да такіх умоў, але арганізм пажылога чалавека ўжо не настолькі гнуткі. Акрамя таго, у спякоту нас падцікоўвае сонечны і цеплавы ўдары, а таксама абязводжванне. Апошняе тоіць у сабе сур'ёзную небяспеку. З узростам зніжаецца вастрыня ўспрымання пачуцця смагі і голаду (гэта звязана з зхуткасцю перадачы імпульсаў у мозг). Дэгідратацыя арганізма ў сталым узросце летам — досыць частая з'ява. Павышаючы вязкасць крыві, яна запускае механізм развіцця трамбозу ў сасудах сэрца і галаўнога мозга (вынікам можа стаць інфаркт або інсульт), тлумачыць Людміла Жылевіч. З'яўляюцца пачашчанае сэрцабіцце, болі ў сэрцы. А скарачэнне мочаспускання становіцца прычынай інтаксікацыі.

Калі вы заўважылі прыкметы абязводжвання (пачырваненне і сухасць скуры, рэзь у вачах, адсутнасць апетыту, дыхавіца, дрымотнасць, зніжэнне тонусу мышцаў), меры патрэбны неадкладныя. Прыміце ляжачае становішча ў цёмным прахалодным пакоі. На лоб і тулава можна пакласці кампрэс з мокрай тканіны. Дапаможа рэгідрацыйны раствор: у літры вады пакаёвай тэмпературы растварыць 1 ст. л. цукру і 0,75 ч. л. солі, уліць у гэтую сумесь 1/2 шклянкі апельсінавага соку (ён прыўнясе ў арганізм страчаныя натрый і калій). Піць такі «кактэйль» трэба маленькімі глыточкамі, лепш за ўсё — праз трубачку.

Перагрэў можа стаць вынікам як знаходжання на сонцы без галаўнога ўбору, так і знаходжання ў душным памяшканні: кроў згушчаецца, кіслароду пачынае катастрафічна не хапаць. Сімптомы, якія дапамагаюць выявіць цеплавы ўдар, — пашыранне зрэнак, кроў з носа, смага, пачашчанае сэрцабіцце, болі ў мышцах, ваніты, сухая гарачая скура. Сонечны ўдар праяўляе сябе наймацнейшай мігрэнню і галавакружэннем, млоснасцю, пачырваненнем скуры твару і пацямненнем у вачах, а таксама магчымымі ванітамі. У абодвух выпадках да пажылога чалавека лепш выклікаць «хуткую дапамогу». А да яе прыезду — пакласці яго, прыпаднявшы галаву, у прахалодным памяшканні, расшпіліць вопратку, абцерці вадой пакаёвай тэмпературы, даць выпіць злёгку падсоленай вады, раіць галоўны герыятр.

Але, лепш за ўсё, не дапусціць з'яўлення вышэйпералічаных сімптомаў. Найперш, ужо пасля 45—50 гадоў паспрабуйце наогул не загараць. Абараніце цела адзеннем з натуральнай тканіны, бо з узростам скурнае покрыва становіцца танчэйшым. Пік дзённай спякоты (прыкладна з 11.30 да 16.00) лепш правесці ў прахалодным памяшканні. І шпацыраваць, і працаваць на агародзе варта раніцай і ўвечары. Ды і ў «дазволеныя» для прагулак гадзіны трымайцеся ў цені. Важна піць дастаткова вадкасці — не менш чым 1,5—2 л. Можна проста наліваць сваю дзённую норму ў графін і пакідаць на стале, сочачы за тым, каб да вечара ён апусцеў. Медыкі падкрэсліваюць, што ў паняцце «дастатковая колькасць вадкасці» не ўваходзяць кава і нават гарбата і, вядома, салодкая газіроўка, крамныя сокі з лішкам цукру, а таксама алкаголь. Гэта павінна быць чыстая пітная вада, морсы, несалодкія ўзвары. А ідэальны стол пры гарачым надвор'і — спалучэнне малочных страў і зеляніны, садавіны і гародніны.

### КАБ РАДАСЦЬ НЕ СТАЛА БЯДОЙ

Лета ў бабулі і дзядулі — наша нацыянальная традыцыя. Але медыкі раяць бацькам адэкватна ацаніць стан пажылога чалавека, перш чым «скідаць» на яго сваіх дзяцей.

— Зносіны пажылых людзей і дзяцей дабратворна ўплываюць на абодвух: у адных ёсць мудрасць і цярпенне, у другіх — патрэба ў душэўным цяпле. Але, адпраўляючы дзяцей да бабуль і дзядуль, на дачу або ў вёску, мы павінны разумець, у якім статусе знаходзіцца пажылы чалавек, — падкрэслівае Людміла Аверкіеўна. — Калі, дапусцім, бабулі 60 і яна пачуваецца добра або дзед яшчэ поўны сіл, гэты «душэўны ўзаемаабмен» будзе дабратворны для ўсіх. Але калі нашы пажылыя бацькі рухаюцца да ўзросту 75 або 75+, хутчэй за ўсё, у іх пачынаюцца праблемы, звязаныя з развіццём атэрасклерозу сасудаў галаўнога мозга, паступова парушаецца кагнітыўны статус. Яны хутчэй стамляюцца, дрэнна пераносяць шум, ім проціпаказана хваляваліца і трывожыцца. Стомленасць бабулі і дзядулі гатовыя пераадольваць дзеля любімых унукаў, але гэта ім не на карысць.

Магчыма, лепш прыехаць да іх разам з дзецьмі падчас вашага працоўнага адпачынку, каб узяць на сябе клопаты па гатаванні ежы, мыцці вопраткі, прыборцы, а бабулям і дзядулям пакінуць толькі радасць зносін з унукамі. Або вы пакідаеце ўнука з такой узроставай бабуляй, але дзіця ўжо не маленькае (старэйшае за 10 гадоў) і, у прынцыпе, можа забяспечваць сваю жыццядзейнасць самастойна. У гэтым выпадку ўжо малодшае пакаленне сям'і становіцца апорай для пажылога чалавека. З выхаваўчага пункту гледжання гэта вельмі карысна, падкрэслівае галоўны герыятр, але дзіцяці трэба растлумачыць, што бабуля цяпер сама патрабуе клопату, і павінна адбыцца пераразмеркаванне роляў і абавязкаў. Вядома, маленькіх дзяцей на такіх бабуль і дзядуль пакідаць нельга. Варта разумець: можа здарыцца, што пажылому чалавеку стане дрэнна, і ў гэтым выпадку дзіця акажацца без дагляду.

### НЕ СТРАЦІЦЬ ЗДАРОЎЕ Ў АГАРОДЗЕ

Работы на сваіх «сотках» маюць мноства станоўчых бакоў. Фізічная актыўнасць падтрымлівае арганізм у тонусе, вітаміны ўмацоўваюць імунітэт, ураджай прыносіць маральнае задавальненне, свежае паветра дабратворна ўплывае на нервовую сістэму. І, тым не менш, праца на градках можа стаць прычынай рэзкіх скачкоў артэрыяльнага ціску і нават гіпертанічнага крызу, сонечнага або цеплавога ўдару, абязводжвання, абвастрэння ішэмічнай хваробы сэрца і многіх іншых сур'ёзных паталогій. Як не страціць здароўе ў агародзе?

• Працу і адпачынак варта чаргаваць. Ідэальны варыянт — 45 хвілін працы і 15 хвілін перапынку (невыпадкова гэтая аптымальная схема намаганняў і адпачынку ўзятая за аснову ў школах). Падчас «перамены» расслабцеся, прыляжце і заплюшчыце вочы. І наступны этап фізічных намаганняў будзе ў радасць.

• Становішча «ўніз галавой» падчас пасадкі або праполкі — зусім не для гіпертонікаў, а праблемы з артэрыяльным ціскам пасля 60 гадоў ёсць практычна ў кожнага. Акрамя таго, у такой позе пазваночнік адчувае сур'ёзныя нагрузкі — і гэта можа стаць прычынай абвастрэння радыкуліту і астэахандрозу. Няўдалае рашэнне — і доўгае знаходжанне на кукішках: парушэнне кровавароту прывядзе да скачкоў артэрыяльнага ціску, плюс рызыка траўміравання каленных і тазасцегнавых суставаў. Выйсце — праца на нізкай лавачцы. Таксама дапамогуць наколеннікі і кілімкі, на якія можна ўстаць каленамі, каб пастава была больш бяспечнай.

• У самы гарачы час сутак неабходна знізіць актыўнасць — да поўнага выключэння фізічных нагрузак. Ды і раніцай, і пасля 16.30 беражыце ад абгарання твар, шыю, рукі. У дапамогу — шыракаполыя капелюшы, сонцаахоўны крэм, натуральнае адзенне з доўгімі рукавамі. Абавязкова выконвайце пітны рэжым, асабліва калі працуеце ў парніку або цяпліцы. Памятайце: для людзей з артэрыяльнай гіпертэнзіяй работы ў цяпліцы ў гарачы час сутак проціпаказаны. Выконваць іх можна толькі раніцай (вельмі ранняй) або пасля заходу сонца, папярэджвае Людміла Жылевіч.

• На агародзе раз-пораз даводзіцца пераносіць цяжкія прадметы. Вынікам перанапружання могуць стаць спазмы мышцаў, ушчамленне нервовых канчаткаў, болі ў шыі і спіне. Размяркоўваем нагрузку на абедзве паловы цела: груз лепш раўнамерна раскласці ў два вядры і ўзяць іх у абедзве рукі. Падымаючы цяжкае з зямлі, цягнем не спіной, а разгінаючы злёгку сагнутыя калені. А наогул лепш скарыстаецца тачкай.

• Фізічную нагрузку, якой патрабуе праца на асабістым прысядзібным або дачным участку, фізіёлагі называюць адной з найбольш карысных. Але, як любая фізічная нагрузка, яна патрабуе размінкі. Перад працоўнай актыўнасцю на градках раніцай зрабіце комплекс павольных, нескладаных практыкаванняў на шыю, плечавы пояс, паясніцу. Разамніце рукі і ногі. Так вы знізіце рызыку атрымання траўмаў.

### ЖЫЦЦЁВА ВАЖНА

Найважнейшае пытанне — аптэчка, якую трэба ўзяць у «домік у вёсцы».

— Людзі, якія прымаюць базавую тэрапію, павінны паклапаціцца пра сябе загадзя. Вы ведаеце, на які тэрмін адбываеце на «летні сезон», і на гэты час маеце права выпісаць лекавыя прэпараты, якія прымаеце ў сувязі з хранічнымі захворваннямі, — адзначае Людміла Жылевіч. — Іх дастатковы запас павінен быць у вас у аптэчцы. Таксама абавязковыя прэпараты экстраннай дапамогі. Часцей за ўсё такія выпадкі звязаны з гіпертанічным крызам, праблемамі са страваваннем, прастудай. Нельга забываць і пра перавязачныя матэрыялы.

### МЫ Ў АДКАЗЕ

І, нарэшце, рэкамендацыі тым, хто ў адказе за састарэлых сваякоў.

Кожны цёплы сезон ратавальнікі шукаюць пажылых людзей, якія заблукалі ў лесе. Між тым пазбегнуць гэтай праблемы — у вашых сілах.

Заўважыўшы, што пажылы чалавек губляецца ў незнаёмай абстаноўцы, першыя паходы па «прагулачным» маршруце ў новым месцы прайдзіце разам з ім. Пагладзіце, дзе будуць прыпынкі, каб ён мог перадыхнуць у цяньку, калі будзе шпацыраваць тут адзін.

— Калі вашы пажылыя сваякі ўжо недастаткова талерантныя да нагрузак, важна прадугледзець для іх магчымасць прысесці падчас прагулкі. Гэта можа быць хоць бы дыванок, які трэба даць ім з сабой, — кажа галоўны герыятр.

Важна, каб на прагулцы ў лесе ў пажылога чалавека ў кішэні заўсёды былі прэпараты экстраннай дапамогі (напрыклад, нітрагліцэрын, каптапрыл), засяроджвае ўвагу суразмоўніца. Прасачыце таксама, каб яго адзенне было зручным і каб ён узяў з сабой пітную ваду і лёгкі перакус. Усё гэта лепш скласці ў заплечнік: так рукі будуць вольныя.

У людзей, старэйшых за 75 гадоў, абавязкова павінна быць з сабой інфармацыя пра іх: прозвішча, імя і імя па бацьку, адрас, тэлефоны сваякоў. Лепш, каб гэта было на папяровым носьбіце ў непрамакальным файле — тэлефон можа разрадзіцца.

Адпускаючы пажылога блізкага ў грыбы, ягады або проста на шпацыр, наладзьце GPS-навігацыю. Раннія праявы дэменцыі ў звыклай абстаноўцы часцяком пра сябе не заяўляюць, але, апынуўшыся ў незнаёмым месцы, пажылы чалавек атрымлівае стрэс, з якім можа не справіцца.

— Чалавек з пачатковымі праявамі дэменцыі можа блукаць па лесе ў пошуках зрокава знаёмага месца і праходзіць вялікія адлегласці, рабіць нечаканыя павароты. Прадбачыць, дзе ён апынецца, вы не зможаце, — тлумачыць Людміла Жылевіч. — І тут дапаможа GPS-навігацыя.

Урач адзначае, што новае асяроддзе абвастрае праявы дэменцыі, таму лепш узяць некалькі адгулаў на працы і правесці гэтыя дні разам з пажылым чалавекам на дачы ці ў вёсцы (калі ён прыязджае туды толькі на лета), каб дапамагчы яму адаптавацца да абстаноўкі, ад якой ён адвык.

Пакідаючы састарэлых бацькоў на дачы, пераканайцеся, што ў іх дастаткова вады. Калі гаворка аб калодзежы, нанасіце вады — не думайце, што пажылы чалавек зможа зрабіць гэта сам. Зразумела, напоўніце халадзільнік. І адрэгулюйце пытанне, як ён будзе гатаваць і падаграваць ежу.

— Часам у людзей ва ўзросце 75—80 гадоў падае сіла кісці рукі і яны не могуць запаліць газ, — кажа суразмоўніца. — Асабліва калі ў аўтазажыгалкі тугі «курок»: яе трэба замяніць на тую, якой пажылы чалавек змога карыстацца. Некаторыя выходзяць са становішча, набываючы электраплiткі. Словам, важна прадумаць, як зрабіць асяроддзе пражывання бяспечным.

На прыродзе даводзіцца больш рухацца: варта паклапаціцца і пра кіёк. Калі ёсць праблемы з галавакружэннем, апорна-рухальным апаратам, хуткай стамляльнасцю, магчыма, патрэбныя нават хадункі. Бо падзенне ў старэчым узросце звычайна суправаджаецца сур'ёзнымі траўмамі.

— Часам пажылыя людзі здольныя перасоўвацца па сваім двары і гародзе, але не ў сілах, напрыклад, дайсці да аўталаўкі. Хадункі на колцах дапамогуць ім заставацца мабільнымі (дарэчы, на іх можна нават прысесці, стаміўшыся). У многіх выпадках у нашай краіне гэтыя сродкі перамяшчэння выдаюцца бясплатна.

Пакідаючы чалавека сталага ўзросту аднаго на тыдзень, важна паведаміць пра гэта суседзям, а ў яго тэлефон запісаць усяго некалькі нумароў — дапусцім, ваш і «хуткай дапамогі» (можна наладзіць функцыю хуткага набору). З'язджаючы, праверце ўсе «пункты бяспекі» — укамплектаванасць аптэчкі, «жыццядзольнасць» батарэі тэлефона, наяўнасць капелюшоў ад сонца і сродкаў ад камароў і кляшчоў. Усё вышэйназванае трэба адсочваць у кожны прыезд. А ў вашу адсутнасць — падтрымліваць штодзённую тэлефонную сувязь.

— Няхай у пажылога чалавека будзе нататнік, куды ён запіша ўсё, што павінен сказаць пры стэлефанаванні, — раіць Людміла Жылевіч. — Здараецца, людзі «ва ўзросце» забываюць агучыць важныя рэчы. А нататкі дапамогуць ім не забыцца паведаміць вам, напрыклад, што ў іх скончыліся пэўныя таблеткі.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# Пад знакам ільну

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Лён нездарма называюць беларускім золатам, гэта першая культура, якую нашы продкі навучыліся апрацоўваць і выкарыстоўваць. А горад Орша, што ў паўночным рэгіёне, вядомы не толькі сваёй гераічнай гісторыяй, але і адным з самых буйных на тэрыторыі краін СНД прадпрыемствам па вытворчасці тканін з ільну і вырабаў з яго — Аршанскім ільнокамбінатам. За слаўную, амаль векавую, гісторыю дзейнасці камбіната праз яго цэхі прайшло не адно пакаленне аршанцаў, таму Дзень работнікаў лёгкай прамысловасці ў раёне заўсёды адзначалі на высокім узроўні. Вось і сёлета фестываль «ИзумЛЁНный край» быў прымеркаваны да гэтага прафесійнага свята.



Уверцюрай да фестывалю стала адкрыццё выставы «Ільняная палітра», дзе мясцовыя мастакі прадставілі свае карціны з пейзажамі Аршаншчыны. Супрацоўнікі раённага аддзела загса правялі льняное вяселле: гэты сімвалічны абрад стаў на фестывалі ўжо традыцыйным. Праз чатыры гады сямейнага жыцця — менавіта чацвёртая гадавіна называецца льняной — зноў «пажаніліся» Міхаіл і Анастасія Ларанковы. Маладая пара пазнаёмілася, як гэта сёння часта бывае, у інтэрнэце, хоць заўсёды жылі побач у адным горадзе. Разам сужэнцы ўжо сем гадоў, чатыры з якіх — у афіцыйным шлюбе. Міхаіл працуе дзяжурным па парку на чыгуначнай станцыі «Орша-Усходняя», Анастасія — у аддзеле прымусовага выканання судовым выканаўцам, іх аб'ядноўвае любоў да падарожжаў і, вядома ж, каханне. Праз чатыры гады Ларанковы зноў увайшлі ва ўрачыстую залу. Разам з парай былі бацькі, блізкія і калегі. Маладым завязалі ручніком рукі, запалілі сямейны ачаг і ўручылі льняныя падарункі.








Афіцыйнае адкрыццё фестывалю пачалося з урачыстага шэсця, у якім узялі ўдзел звыш 500 чалавек з 20 творчых калектываў вобласці. Сёлета ў раённым фестывалі ўдзельнічала і дэлегацыя з Магілёўшчыны, таму, магчыма, хутка свята набудзе статус абласнога.

Старт святочным мерапрыемствам на галоўнай сцэне перад гарадскім Домам культуры «Орша» даў **начальнік аддзела культуры Сяргей ГАРБАЧОЎ.** Ён зачытаў жыхарам і гасцям горада прывітальны адрас старшыні Аршанскага райвыканкама Ігара Мароза: «Ідэя стварэння такога фестывалю ўзнікла некалькі гадоў таму і за гэты час змагла згуртаваць вакол сябе сапраўдных аднадумцаў. Мерапрыемства становіцца традыцыйным у жыцці Оршы, бо менавіта гэты горад называюць калыскай беларускага льну. Невыпадкова мерапрыемства прымеркавана да важнага свята — Дня работнікаў лёгкай прамысловасці Рэспублікі Беларусь. Наш фестываль — гэта садзейнічанне стварэнню новых брэндаў у галіне лёгкай прамысловасці з выкарыстаннем гісторыка-культурнай спадчыны, крэатыўных тэхналогій, наяўнага эканамічнага, вытворчага, адукацыйнага патэнцыялу».



У зале Дома культуры прайшоў конкурс Fashion-2023, у межах якога 11 калектываў-тэатраў мод Віцебшчыны прадставілі свае калекцыі з ільну. Тэкстыльнае спаборніцтва праходзіла ў трох узроставых катэгорыях, журы ацэньвала і самых маленькіх модніц, і прадстаўніц паважнага ўзросту. Розныя колеры, формы, стылі, музыка — відовішча атрымалася захапляльным. Пераможцамі ў катэгорыі 6—12 гадоў сталі дзяўчаты з узорнага тэатра моды «Дзіва» Віцебскага гарадскога цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі; «золата» ў катэгорыі 13—18 гадоў атрымалі адразу два калектывы — дубровенскі узорны тэатр моды «Шанц» і глыбоцкі «Аліса». У змешанай катэгорыі на першую ступень п'едэстала падняліся калектывы Цэнтра культуры «Віцебск».

На пляцоўцы каля ГДК разгарнуліся гандлёвыя і рамесныя рады: тут праходзілі майстар-класы па апрацоўцы дрэва, ганчарстве, любы ахвотны мог набыць памятныя сувеніры і ўпрыгажэнні. «Разыначкай» фестывалю стаў майстар-клас па апрацоўцы льну, дзе быў паказаны ўвесь шлях яго вытворчага працэсу — ад зярнятка да палатна. Запрашалі на свае падворкі і харчовыя прадпрыемствы Аршаншчыны ў межах гастрашоу па прыгатаванні страў і напояў з дабаўленнем ільну. Журы і госці змаглі пачаставацца льняным кісялём, печывам з семечкамі і мяснымі вырабамі.

На працягу дня калектывы Віцебскай вобласці дарылі музычныя падарункі гораду. А вечарам на галоўнай сцэне фестывалю прайшло ўшанаванне найлепшых тэкстыльшчыкаў Аршаншчыны. З віншавальным словам да работнікаў лёгкай прамысловасці звярнуўся **намеснік старшыні Аршанскага райвыканкама Віктар КАЛАЧОЎ:** «Аршаншчына па праве носіць званне калыскі беларускага льну. Прадпрыемствы лёгкай прамысловасці ўносяць значны ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё рэгіёна. Сёння Аршанскі льнокамбінат з'яўляецца флагманам ільняной галіны, а тавары пад брэндам «беларускі лён» ведаюць і любяць больш чым у 40 краінах свету. Прамыслова-гандлёвая фірма «Світанак» — адно з вядучых прадпрыемстваў па вытворчасці дзіцячай вопраткі. Яна, як і камбінат, заслужана занесена на Дошку гонару Аршанскага раёна па выніках 2022 года. У раёне вялікая ўвага аддаецца падрыхтоўцы кадраў: Аршанскі дзяржаўны каледж тэкстыльшчыкаў імя Сямёнава рыхтуе высокакваліфікаваных спецыялістаў для прадпрыемстваў не толькі раёна, але і краіны».

У гэты вечар было шмат віншаванняў і ўзнагарод ад імя райвыканкама, раённага аб'яднання прафсаюзаў, кіраўніцтва Аршанскага льнокамбіната. У ліку ўзнагароджаных — выкладчыкі і майстры каледжа тэкстыльшчыкаў, швачкі, эканамісты, фарбавальшчыкі, раскройшчыкі, краўцы, прыбіральшчыкі. Гэта тыя людзі, на якіх трымаецца льняная галіна Беларусі. Свае ўзнагароды атрымалі і маладыя спецыялісты льнокамбіната — пераможцы традыцыйнага конкурсу прафесійнага майстэрства.

У падарунак спецыялістам і гораду вечарам на галоўнай сцэне выступіў гурт «Аўра». Фінальнымі святочнымі акордамі фестывалю сталі дыскатэка і салют.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

**Фота «Віцебскія весткі».**

# КАЛЕЙДАСКОП БЕЛАРУСКАГА КАЛАРЫТУ

## Цікавінкі «Маладзечна-2023»

XXII Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі
Мала93ечна-2023

**На мінулых выхадных у Маладзечне прайшло яркае мерапрыемства: XXII Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2023». Што там было цікавага? Якія вынікі ў конкурсаў? Пра гэта і многае іншае — у нашым рэпартажы.**

Праграма фестывалю аказалася сапраўды насычаная. На два дні было запланавана больш за паўсотні мерапрыемстваў, сярод якіх творчыя сустрэчы, канцэрты, выставы, тэатральныя пастаноўкі, майстар-класы і нават кінапаказ пад адкрытым небам. Чырвонай ніткай праз усе мерапрыемствы ішла тэма Года міру і стваральнай працы.









**Са сцэны Летняга амфітэатра міністр культуры Анатоль Маркевіч заявіў, што 22-і фестываль ужо становіцца гісторыяй. — Гледачам, гасцям свята ён падарыў сапраўдныя эмоцыі, сустрэчы, мерапрыемствы, — падкрэсліў міністр, — Беларусы ў чарговы раз усвядомілі, што могуць ганарыцца сваёй вялікай гісторыяй і невычэрпна багатай нацыянальнай культурай.**

### ЧАРОЎНАСЦЬ ПАЭТЫЧНАГА СЛОВА

Маладзечна зззяла яркімі фарбамі. Вочы разбягаліся ад прыгажосці. Хацелася наведаць усё і адразу. Прыцягнула ўвагу пляцоўка Мінскага раёна. Там на крэслах-мяшках сядзелі восем школьнікаў у беласнежных кашулях, быццам чакаючы чагосьці. Пацікавілася ў аднаго з куратараў пляцоўкі, Алены Ледаховіч, намесніка дырэктара дзяржаўнай установы «Мінскі раённы Цэнтр культуры», якую ж праграму яны падрыхтавалі? Аказалася, што тут размясцілася музычна-паэтычная гасцёўня пад назвай «Сэрцам роднага слова краніся» з літаратурнымі чытаннямі, тэматычнымі конкурсамі малюнкаў і віктарынай па беларускай мове. А дзяўчынкі і хлопчыкі сядзяць тут не проста так — гэта амаль сапраўдныя акцёры (усе яны займаюцца ў тэатральным гуртку «Д-Арт» Навасельскага Цэнтра культуры і вольнага часу) і вось-вось пачнуць чытаць вершы Уладзіміра Карызны для наведвальнікаў фестывалю. Юныя чытальнікі ахвотна пагадзіліся падзяліцца сваімі ўражаннямі. Яны выступаюць ужо другі дзень, таму ім амаль не страшна. Па словах рабят, гледачоў тут, у музычна-паэтычнай гасцёўні, хапае, але ж з асаблівай увагай вершы слухаюць менавіта прадстаўнікі старэйшага пакалення.

### ТРАДЫЦЫІ НАРОДНЫХ МАЙСТРОЎ

Разглядаем далей гэты калейдаскоп беларускага каларыту. На гэты раз не змагла прайсці міма майстрыхі з Валожынскага раёна. Алена Рыснік захоплена пляла пояс у асаблівай тэхніцы, якая называецца «пояс на ніту», — робіцца пры дапамозе выцягнутай нагі. Над гэтым поясам яна працавала на працягу ўсяго фестывалю.

— Вопыт па пляценні паясоў мы перанялі ў сваіх мясцовых бабуль, — дзеліцца жанчына. — Яны распавядалі, што калісьці дзяўчыне, якая выходзіла замуж, трэба было зрабіць больш за сто паясоў.

У парку, апроч атракцыёнаў, кіёскаў з салодкай ватай і дзяцей з бацькамі, было шмат выпускнікоў. Сёлета вырашылі ўпершыню сумясціць святкаванне фестывалю і выпускныя ў школах Маладзечанскага раёна. З самай раніцы дзяўчаты і юнакі ўрачыста прайшліся па горадзе — найлепшыя з іх атрымалі атэстаты і залатыя медалі ў амфітэатры.

### ФАРБЫ І РЫФМЫ

А цяпер давайце з вясёлых, шумных фестывальных вуліц перанясёмся ў больш спакойнае месца: у цэнтральную раённую бібліятэку імя М. Багдановіча. Там сабралася нямала людзей, бо менавіта ў другі фестывальны дзень на гэтай пляцоўцы ў рамках выставы «Прыцяжэнне» была запланавана сустрэча з мастаком, адным з выдучых беларускіх майстроў акварэлі Мікалаем Аўчыннікавым. Яго палотны могуць паслужыць для гледачоў своеасаблівай машынай часу. Мастак заўсёды імкнуўся паказаць беларускія краявіды і помнікі архітэктуры, дэманструючы непарыўную сувязь паміж мінулым і сучасным.

Спакойная і па-хатняму душэўная атмасфера панавала і ў літаратурна-музычнай гасцёўні «Радзіма мая міралюбная» ад Саюза пісьменнікаў Беларусі. Там сабраліся беларускія паэты і артысты, каб пачытаць свае вершы, а таксама падвесці вынікі Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу «Радком вярнуся па вясне» сярод маладых паэтаў у гонар памяці лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Міколы Мятліцкага.

### НА СЦЭНЕ — МОЛАДЗЬ

Таксама на працягу ўсяго дня ў гарадскім Палацы культуры праходзіў конкурс маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні. Па яго выніках Гран-пры і прыз імя Уладзіміра Мулявіна заваяваў студэнт 3-га курса Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў Данііл Савеня. На конкурсе ён прадставіў дзве кампазіцыі: «Жаданая» і «Святая асветніца». Цікава тое, што музыку да іх напісала яго настаўніца Алена Атрашкевіч. Першае месца заваявала Маргарыта Шыбаева з Мінскай вобласці, другое падзялілі паміж сабой Аляксандр Журовіч з Мінска і Аляксандр Малашанка з Віцебскай вобласці. А трэцяе месца дасталася Дар'і Чэслаўскай з Магілёўскай вобласці.

Яркім фіналам свята стаў гала-канцэрт закрыцця XXII Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2023». На дадзеным мерапрыемстве са сцэны Летняга амфітэатра міністр культуры Анатоль Маркевіч заявіў, што XXII фестываль ужо становіцца гісторыяй.

— Гледачам, гасцям свята ён падарыў сапраўдныя эмоцыі, сустрэчы, мерапрыемствы, — падкрэсліў міністр. — Беларусы ў чарговы раз усвядомілі, што могуць ганарыцца сваёй вялікай гісторыяй і невычэрпна багатай нацыянальнай культурай.

Падчас гала-канцэрта адбылося ўрачыстае ўзнагароджанне лаўрэатаў Нацыянальнага конкурсу маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні. А далей усё Маладзечна разам з беларускімі эстраднымі выканаўцамі спявала сучасныя хіты. Скончылася свята далёка за поўнач маладзёжнай дыскатэкай на цэнтральнай плошчы.

*Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.*

## ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении **29 июня 2023 года** повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)* |
|---|
| «Нефтепродукт – обводненное (с примесями) сырье для производства мазута (гудрона)» в количестве 2000 тонн (ориентировочно), содержащийся в битумохранилище, расположенном по адресу: Минская область, Дзержинский район, г. Фаниполь, АБЗ «Фаниполь» |
| Начальная цена: 150 000,00 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка: 15 000,00 бел. руб. |

** Покупатель обязуется своими силами, средствами и за свой счет произвести вскрытие битумохранилища, выемку нефтепродукта (продаваемого имущества) с полной зачисткой всего содержимого битумохранилища, включая утилизацию отходов: загрязненного песка, грунта и т. п., с представлением разрешительных документов Министерства природных ресурсов и охраны окружающей среды Республики Беларусь, а также вывоз сырья с территории производственной базы продавца имущества. Окончательное количество продаваемого имущества определяется по мере выборки нефтепродукта с учетом его контрольного взвешивания.*

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, кодификатор назначения платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **29 июня 2023 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 13.06.2023 по 27.06.2023 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону (017) 388-43-21.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

---

Центр Промышленной Оценки
• **ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
• **ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Белцветмет», Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, 42/2, район аг. Гатово |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 **(www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет электронных торгов: транспортные средства с пробегом**
Месторасположение:
Минский р-н, Новодворский с/с, 42/2, район аг. Гатово

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **МАЗ-6303А5,** № кузова Y396303TPA0056034/ Y3M6303A590001417, р/зн. 5МНТ 2182 (AI 7794-5), 2009 г. в., инв. № 3910 | **46 700,00** |
| 2 | **Грузовой бортовой МАЗ-6303А5,** № кузова Y3M6303A5D0003121, р/зн. АН4441-5, 2013 г. в., инв. № 4300 | **23 200,00** |
| 3 | **Прицеп бортовой MAZ-837810-(042),** № кузова Y3M837810A0012852, р/зн. А 8599 А-5, 2010 г. в., инв. № 4020 | **6 800,00** |
| 4 | **Полуприцеп бортовой тентовый MAZ-975830 3021,** № кузова Y3M975830A0004194, р/зн. А 8042 А-5, 2010 г. в., инв. № 3960 | **6 600,00** |
| 5 | **Полуприцеп бортовой тентовый MAZ-975830 3021,** № кузова Y3M975830A0004198, р/зн. А 8041 А-5, 2010 г. в., инв. № 3961 | **6 600,00** |
| 6 | **Полуприцеп бортовой тентовый MAZ-975830 3021,** № кузова Y3M975830A0004202, р/зн. А 8040 А-5, 2010 г. в., инв. № 3959 | **6 600,00** |
| 7 | **Полуприцеп бортовой тентовый MAZ-975830 3021,** № кузова Y3M975830A0004192, р/зн. А 8019 А-5, 2010 г. в., инв. № 3940 | **6 600,00** |

Цена снижена на 20 % по лоту № 1, на 10 % по лотам № № 2–7

С подробной информацией по предмету торгов можно ознакомиться на сайте организатора торгов **www.cpo.by**. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | 100 % от цены продажи предмета торгов оплачиваются в течение **10 рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи |

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение по лотам № № 1, 2 – 5 %, по лотам № № 3–7 – 7 % от цены продажи лотов в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» лот № 1 – 19.05.2023, лоты №№ 2–7 – 05.05.2023

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 30.06.2023 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 29.06.2023 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06, auction@cpo.by**

---

Центр Промышленной Оценки
• **ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
• **ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Слонимский агросервис», 231800, Гродненская обл., г. Слоним, ул. Строителей, 8 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов: имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: Гродненская обл., Слонимский р-н, дер. Чемеры, ул. Грибовская**

| Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена с НДС 20 % |
|---|---|
| **Здание пожарного поста** (здание специализированное иного назначения), инв. номер 450/С-14698, общей площадью 34,3 кв. м | **106 320,00 бел. руб.** |
| **Здание мастерской** (здание специализированное иного назначения), инв. номер 450/С-14717, общей площадью 1524 кв. м | |
| **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 425483307102000025:** предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений общей площадью 2,5948 га. До момента проведения электронных торгов Продавец обязуется выделить земельные участки, необходимые для обслуживания предмета электронных торгов | |

**Задаток 10 %** от начальной цены лота в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 15 (пятнадцать) рабочих дней со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **5 %** от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 14.07.2023 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 13.07.2023 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

---

## ООО «СпецРеализация»

объявляет о проведении вторых повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – **ЗАО «Эрмес – Маркет»**
(УНП 190485521, г. Минск, ул. Захарова, д. 19, комн. 7а).

***Дата и время проведения торгов*: 23 июня 2023 года.**

Начало – 10.00. Заявки принимаются с 13 июня 2023 года по 22 июня 2023 года.

***Место проведения торгов:*** Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:*** ЗАО «Эрмес – Маркет» (УНП 190485521) в лице ликвидатора – директора ООО «Консалтинговая группа «ПРАВО» Мамедовой В.О.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 2 %. Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайте http://www.specrealization.by. Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.

Сведения о предыдущих торгах:

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 64 (29944) за 05.04.2023.

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 92 (29972) за 17.05.2023

---

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Могилевский мясокомбинат»

**Аукцион состоится 18.07.2023 в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.**

**<u>ЛОТ № 1:</u> ТОРГОВЫЙ ПАВИЛЬОН (инв. № 10017), пл. 15,7 кв. м.**

***Начальная цена продажи: 4 120,70 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 412,07 бел. руб.***

**Местоположение: г. Могилев, ул. Островского, в р-не Универсама № 4.**

Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа – 40901. Срок подачи документов для участия в аукционе: по 17.07.2023 до 11.00. Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона ino.by.

**Доп. информацию можно получить по тел. +37529-624-26-25, Mogilev@ino.by**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

## ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА – ЧЕРВЕНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

| № лота | Сведения о виде и предмете аукциона | Адрес объекта и его наименование | Срок аренды | Начальная цена объекта (рублей) | Сумма задатка (рублей) | Расходы по организации и проведению аукциона (рублей) | Ограничения (обременения) прав в использовании земель и другие ограничения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Аукцион на право аренды земельных участков | Земельный участок для строительства и обслуживания производственного объекта, район д. Гудовичи Смиловичского с/с Червенского р-на, площадь 1,4406 га, кадастровый номер 625883500001001174 | 99 лет | 19 880,28 | 1 988,03 | 92,5 + расходы по размещению извещения в СМИ | Охранные зоны линий электропередачи – площадь 0,072 га |

Аукцион состоится **14 июля 2023** года в 11.00 в здании Червенского райисполкома (зал заседаний) по адресу: г. Червень, пл. Свободы, 1.

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в указанный срок подает: заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона; документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка. Кроме того, в комиссию представляются документы в соответствии с п. 11 Положения о порядке организации и проведения аукционов на право аренды земельных участков, п. 13 Положения о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность гражданам, утвержденных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 13.01.2023 года № 32. При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с момента опубликования извещения в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Червень, пл. Свободы, 1, райисполком, кабинет 69, тел. 80171428491 по 13 июля 2023 года включительно.

**Сумма задатка в размере 10 %** от начальной цены земельного участка перечисляется на расчетный счет BY94AKBB36410627000026000 в ЦБУ 627 филиала № 500 МУ ОАО «АСБ «Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 600008398.

Условия проведения аукциона – наличие не менее двух участников. При наличии единственного участника, аукцион признается несостоявшимся. Единственный участник несостоявшегося аукциона вправе приобрести земельный участок за начальную цену с учетом 5 % к начальной цене этого земельного участка.

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

*Ірына Войтка — паэтэса, аўтар кніг «Спасціжэнне», «Пагляджу вачамі неба», «Кранаюся вечнасці». Піша і прозу. Жыве ў Слоніме, кіруе літаратурным аб'яднаннем імя Анатоля Іверса пры газеце «Слонімскі веснік».*

*У апавяданні, прапанаваным на конкурс, аўтар запрашае нас зазірнуць на вясковы падворак, дзе з надыходам вясны «ўсё загуло, зашумела, засвістала, зацвіркала, засмяялася, засвяцілася», адчуць радасць старой Мары, якая пасля доўгай зімы вярнулася ў родную хату. А тым часам на падворку і вакол яго з'явіліся новыя жыльцы...*

**Алена БРАВА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Ірына ВОЙТКА**

# БАБУЛЯ І БУСЛЫ

У гэтым годзе гаспадыня хаты бабуля Марыя вярнулася дамоў ад дачкі з горада пасля доўгай зімы позна. Ужо шумела навокал зялёнымі хвалямі лісце паабапал дарогі і на падворку, у садзе адцвіталі яблыні і іншае прысаддзе. Калі машына спынілася на дарозе каля роднай хаты і бабуля, высунуўшы ногі з салона аўто, абапіраючыся на кіёчак, ледзь-ледзь узнялася і спрабавала зрабіць першыя крокі па доўгачаканай зямлі, усё навокал загуло, зашумела, засвістала, зацвіркала, засмяялася, засвяцілася...

— Ох, — уздыхнула жанчына і прыпынілася, каб паслухаць і паглядзець на ўсё гэта незвычайнае вясновае хараство. — Дзякуй богу, дзякуй богу, паразімавала.

Лёгкі свежы ветрык дыхнуў ёй у твар, абкруціўся вакол стану і шмыгнуў паміж жардзінамі плота ў садок. Родны дом глядзеў вокнамі напружана, нібы пазнаючы гаспадыню: так доўга, так доўга не ехала. Шэры верабей, седзячы на весніцах, выцер дзюбку аб пер'е і засяродзіўся, выцягнуўшы шыйку, на новым відовішчы: бабуля пайшла ад машыны ў бок электрычнага слупа і задзерла галаву ўверх. Там на вышыні, у нядаўна збудаваным гняздзе, стаялі бусел з бусліхай і таксама зацікаўлена пазіралі на бабулю і машыну з пасажырамі, нібы хацелі спытацца: а вы хто такія, што вам тут трэба?

— А вось і буслы! Глядзіце, якія! А колькі галля нацягалі наверх, а ўніз колькі ўпала, — сказала дачка.

— А гэта ж трэба, увесь ліхтар замуравалі! А як жа цёмна будзе ў пакоі ноччу... ай... ай, — разбедавалася бабуля Марыя.

— Ну, што ты, матуля, то ж добрая прыкмета: буслы на нашым слупе гняздо збудавалі! А святла хопіць і нам, і буслам, — адказала дачка.

Бабуля апусціла галаву, зрабіла крок у бок хаты і тут жа забылася пра буслоў:

— Добры дзень, хатка, як ты тут без мяне? — выдыхнула яна і паволі пайшла ў адкрытыя весніцы на падворак.

Ах, як усё змянілася за некалькі месяцаў! У палісаднічку пры ўваходзе ў двор павырасталі ўжо і шумелі сваім зяленівам кветкі, каля плота ўзняліся кусты гартэнзіі, пакрыліся пупышкамі ў чаканні часу свайго цвіцення бэз і чаромха. Маладыя яблынькі дзёрзка падстаўлялі сонцу свае яркія ружовыя кветкі ў садку каля хаты, яшчэ драмаў вінаград на сваім рыштаванні, сям-там выкінуўшы па лісточку. Трава на падворку нібы войкнула пад калёсамі машыны і прыціснулася да зямлі.

Сямейнікі зайшлі на падворак. І тут усё сведчыла, што без людзей жыццё ідзе поўным ходам: на сцяне хаты ў вазе для кветак шэрыя хуткія птушкі, відаць, пліскі, збудавалі гняздо і па чарзе сядзелі на яйках, высунуўшы хвасты, якія не змяшчаліся ў вазе. Яны хутка запрыкмецілі людзей, адляцелі на суседні провад і некаторы час сядзелі там, назіраючы.

— Ну вось, глядзіце, як кажуць, свята месца пустым не бывае, нас тут не чакалі. Гаварыла, пара ўжо на вёску ехаць, пара! — узрушана вымавіла дачка. — Дзякуй богу за ўсё: і за вясну, і за буслоў, і за плісак! Усім месца хопіць. Ох, якое хараство наўкола! — ускінула рукі ў паветра жанчына.

Зяць адамкнуў дзверы і першым увайшоў у хату:

— Няхай дзверы будуць адчыненыя, і вокны расчыніце, — кінуў ён на хаду.

Бабуля на падворку з цікавасцю разглядвала сваю гаспадарку. Потым ціха пасунулася па невысокіх прыступках у хату і прыпынілася на парозе ад незвычайнага сырога паху ўнутры дома.

— Ох, — уздыхнула яна, адчуўшы гэты чужы, нежылы пах, і пайшла ў свой пакой, дзе весела гуляла сонейка на сценах. Трохі пастаяла, прысела на ложак і паўтарыла: — Дзякуй богу, дзякуй богу!

Пачалося лета: з агародамі, пліскамі і бусламі. Зяць даўно з'ехаў, бо трэба на працу, а дачка на пенсіі, засталася на вёсцы, тут іхняе лецішча.

Бабуля пачала ўжо трохі шпарчэй хадзіць па сцежцы каля дома, заглядвала на агарод, дзе шчыравала дачка. Найчасцей старая прыпынялася каля кветніка ў палісаднічку. Яна нагіналася і паварушвала кіёчкам зямлю, вырываючы лебяду, нешта доўга разглядвала і разважала, гледзячы на кветкавы склад палісаднічка.

Усё пайшло сваёй чаргой, як бы і не было той зімы і таго горада. Вёска даўно ажыла прыезджымі на лета дачнікамі. Прыехала суседка з гарадка і развяла на сваёй, як кажуць, «мужыкоўшчыне» такое хараство: на ўсім падворку радамі паўсталі кветкі, нейкія кусцікі, а таксама невялічкія штучныя сабачкі і смоўжыкі ў сваім манументальным абліччы. Не тыя цяпер хаты, што раней! Калісьці карова, а то і дзве, заходзілі на падворак, скублі пад плотам траву, беглі да вёдраў з вадой, каб напіцца пасля пашы, і прыносілі гаспадыні поўнае вымя малака. А цяпер толькі тыя цацачныя сабачкі пазіраюць з падворка ды лупатыя яркія кветкі. І гэта надта добра па нашым часе! Галоўнае, каб жыў дом, каб нехта ў яго прыязджаў, каб не стаяў запушчаны, выгадаваўшы і пусціўшы ў свет пяцёра дзяцей.

Буслы весела клекаталі ў сваім гняздзе. Яны сталі галоўным відовішчам для мясцовых жыхароў і прахожых. Людзі прыпыняліся, задзіралі галовы ўверх, разглядвалі вялізнае гняздо, якое напалову закрыла вулічны ліхтар, дзівіліся на буслоў і іх «хатнія» звычкі, выказвалі меркаванні: чым не нагода для размовы!

А буслы зажылі сваім буслiным жыццём і больш не звярталі асаблівай увагі на людзей. Яны папераменна сядзелі на яйках (але, відаць, больш бусліха), лёталі з самай раніцы на мелкаводдзе на возера, якое было ад іх на адзін узмах крылаў, клекаталі, нешта дзяўблі. Бусел быў большым і важнейшым, ён на гняздзе знаходзіўся менш, аддаючы ўсё месца сяброўцы, якая сядзела, апусціўшы галаву на сваё пуховае цела. Ён аблюбаваў сабе месца на слупе насупраць, дзе было многа правадоў, стаяў там на адной назе нават ноччу.

А ў зробленым з вазы гняздзе на сцяне хаты ўжо соладка драмалі жаўтаротыя маленькія птушачкі, аж пяцёра!

Уся гаспадарка жыла вірлівым жыццём: нешта расло, нешта лятала, нешта поўзала.

Аднойчы, пасля вячэрняй прагулкі, суседкі бавіліся размовамі і раптам убачылі, што дарогу перабягае шэры камячок на ножках — прама пад вароты, якія вялі да бабулінай хаты. Жанчыны кінуліся да яго: «І вожык тут!» Вожык падсунуў носік пад вароты і прыпыніўся, засяродзіўся: не пралез. Дачка бабы Марыі хутка адчыніла гаспадарчыя вароты: «Вожык, заходзь! Толькі цябе тут і не хапала!» Маленькая калючая жывёлінка імкліва прыпусціла на падворак у найбліжэйшы куст, толькі яго і бачылі. Ну вось, будзе весялей!

Бабуля Марыя раз-пораз заглядвалася на буслоў і нават крыху крыўдавала на іх: у пакоі, дзе яна спала, стала намнога цямней ад таго, што буслы закрылі сваім гняздом амаль увесь вулічны ліхтар. Цяжка старой вытрымаць нечаканую бяссонніцу ў цемры, а так — глядзі на садок, на лісце, якое так хораша блішчала пад святлом з электрычнага слупа. Яна глядзела на буслінае гняздо і аб нечым размаўляла сама з сабою.

А ў цемры гняздо станавілася нейкім дзіўным відовішчам: унутры яго між галін і рознага ламачча пасялілася мноства розных птушак. Яны шморгалі з адтуліны ў адтуліну, перасоўваліся, расставіўшы крылы, па гнязде, і яно здавалася нейкай казачнай гірляндай, што мігцела аж да самай ночы.

Лета набірала градусы, спякота з кожным днём прыбаўлялася, рабілася невыносная.

Людзі заўважылі, што буслы пачалі менш сядзець на яйках і знікалі з гнязда ў поўдзень аж да наступнай раніцы.

— Няўжо яйкі пакінулі? — дзівіліся людзі.

Так працягвалася некаторы час, пакуль бусліха не з'явілася з начнога прыстанішча адна. Яна ўселася на гняздо, скублася, выцірала дзюбу аб пер'е і апускала доўгую шыю.

Бусел прыляцеў толькі назаўтра. Ён не сеў на гняздо, а пікіраваў побач з ім над вясковымі хатамі. Заўважыўшы яго, бусліха ўстала на высокія ногі і, шырока расставіўшы крылы над гняздом, пачала ляскатаць дзюбай, нібы не пускаючы свайго сябра дамоў. Бусел знікаў, зноў аднекуль выныраў, хутка пралятаў над гняздом, выцягнуўшы галаву і як быццам не звяртаючы на яго ніякай увагі. Бусліха, стоячы ў гняздзе, круціла галавой і ляскатала дзюбай. Так працягвалася некалькі дзён.

— І што ж гэта яны, пасварыліся? — трывожыліся людзі.

Бабуля Марыя сачыла за ўсёй гэтай гісторыяй ад самага яе пачатку. Часу, каб назіраць за бусламі, у старога чалавека хапае. Сказаць праўду, бабуля не адчувала вялікага захаплення ад гэтай «парачкі». Аднойчы, седзячы на лаўцы ў садку, яна размаўляла з бусліхай:

— Ну, што, індычка, засталася адна? І што гэта вы робіце, а яйкі чаму пакінулі? Можа, ужо зварыліся ў такой спёцы...

Бусліха глядзела на бабулю зверху ўніз. Потым выцягвала доўгую шыю і ўзіралася ў наваколле.

— І калі вы ўжо выседзіце тых буслянят? Хоць з такім доглядам наўрад ці, — уздыхала старая.

І сапраўды, праз некаторы час знікла і бусліха. Устрывожаныя вяскоўцы глядзелі на пустое гняздо. Можа, там ужо буслянята?

Але буслянят у гняздзе не было. Яно стаяла сярод спякотнага лета, нязвыкла пустое, ссунулася ўніз і закрыла амаль усё святло ад ліхтара. І толькі начныя кватаранты, невялікія птушкі, ладзілі там кожную ноч сваю «дыскатэку».

— Вось вам і буслы... Вось вам і добрая прыкмета... — мармытала сабе пад нос, седзячы на лаўцы ў садку, бабуля Марыя. — Толькі ўсё святло замуравалі... Дык няхай бы, абы дзетак вывелі... Але ж што нарабілі!

Павыляталі ўжо з гнязда — вазы на сцяне хаты — маленькія жаўтароцікі, якія ператварыліся ў шэрых прыгожых птушачак і забаўлялі жыльцоў дома, калі вучыліся лятаць, а іхнія «татка і мамка» аберагалі іх. Птушаняты папіскавалі, садзіліся то на плот, то на траву, бегалі, скакалі, з подбегу ўзмахвалі крыламі і... узляталі! Усе глядзелі з задавальненнем на гэта новае жыццё, якое з'явілася тут разам з кветкамі, травамі, яблыкамі і вішнямі.

Вожык выявіў сябе ў падполлі альтанкі: ён моцна соп, як стары дзед, пыхкаў, нібы бурчаў. Але мышэй і жаб на падворку не было відаць.

Напрыканцы ліпеня ў гняздзе на слупе раптам зноў з'явіліся буслы.

— Гляньце, буслы вярнуліся! — узрадаваліся вяскоўцы.

І сапраўды: маладая пара стройных танканогіх буслоў нечакана пасялілася ў гняздзе. Бусел тут жа пачаў яго рамантаваць, падцягваючы абвіслыя галінкі дзюбай, а яго маладая жонка-бусліха тупала ў гняздзе і радасна сустракала свайго сябра з усіх палётаў. Яны гучна клякаталі, стукаліся дзюбамі, махалі крыламі, сінхронна паварочвалі галовы ўбок і раптоўна зноў сыходзіліся дзюбамі, нарабіўшы шуму на ўсю ваколіцу. Пазіралі адно на аднаго, хавалі дзюбы адно аднаму пад крыло... О, якое гэта было відовішча: улюбёныя буслы! Нікога не заўважаючы вакол сябе, яны быццам прызнаваліся ў каханні.

— І зноў цалуюцца, — гледзячы на буслоў, задаволена сказала бабуля Марыя. — Ну і добра, значыць, на другі год будуць і бусляняты!

Старая пайшла па сцежцы і села на сваё звыклае месца ў садку.

Жыццё працягвалася!

Векапомнае

# НЯБАЧНЫЯ ЗВАНЫ ДАЛЬВЫ

**Трагедыя ў лагойскай Дальве адбылася 19 чэрвеня 1944 года. Гітлераўцы ўжо адступалі, але працягвалі рабіць сваю чорную справу. Усіх дальвінцаў сагналі ў адну хату і падпалілі. У полымі загінулі 44 чалавекі: двое мужчын, 13 жанчын, 29 дзяцей. Да вызвалення Беларусі заставаліся лічаныя дні..**

## 79 гадоў таму нацысты спалілі апошнюю беларускую вёску

Дальву называюць сястрой Хатыні. І невыпадкова: дзве вёскі, разам з людзьмі поўнасцю знішчаныя акупантамі і іх памагатымі, размяшчаліся адна ад адной на адлегласці ўсяго некалькі кіламетраў. Сімвалічна, што мемарыял у Дальве з'яўляецца філіялам Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь».

Аднак калі да мемарыялізацыі хатынскай трагедыі была прыкаваная ўвага вышэйшага кіраўніцтва тагачаснай краіны (Хатынь павінна была стаць — і стала — сімвалам усіх знішчаных у гады Вялікай Айчыннай вайны населеных пунктаў Беларусі), то помнік у Дальве ўзводзіўся на грамадскіх пачатках. Гэты невялічкі населены пункт мог так і застацца толькі на даваенных картах, у архівах ці ў памяці жыхароў суседніх вёсак, калі б не Мікалай Гірыловіч. Ён — адзіны дальвінец, які не згарэў разам са сваёй вёскай. Нават уявіць страшна, што перажыў гэты чалавек — па сутнасці, дзіця, якому ў чэрвені 1944 года было ўсяго 13 гадоў. У адзін дзень Коля Гірыловіч страціў усіх самых родных і блізкіх людзей. У жудасным вогнішчы, распаленым фашысцкімі нелюдзямі, загінулі яго мама, тата, дзядуля і тры малодшыя браты: Косця, Жэня і Валодзя. За некалькі дзён да доўгачаканага вызвалення хлопчык застаўся круглым сіратой.

Няўжо матчына сэрца прадчувала бяду? Менавіта мама за некалькі гадзін да трагедыі адправіла Колю ў поле — каб той падмяніў бацьку, які кіламетры за два ад вёскі пасвіў каня. Як толькі ў Дальве пачуліся выбух і выстралы, Коля Гірыловіч узяўся разблытваць каня, але жалезныя ланцугі не паддаваліся рукам хлопчыка. І тады ён кінуўся ў бок вёскі, над якой ужо ўзнімаўся вялізны слуп дыму. Як ён сам пазней прызнаецца, калі б паскакаў на кані, то апынуўся б у Дальве акурат тады, калі акупанты жорстка распраўляліся з мірнымі жыхарамі — яго аднавяскоўцамі і самымі дарагімі людзьмі.

«Я прыбег агародамі, праз жыта — дзверы ў хаце адчыненыя, лётае пух ад падушак, пабітае шкло, а на стале лыжкі раскладзены, — успамінаў той страшны дзень Мікалай Гірыловіч. — Выбег з хаты — нікога навокал, толькі праз дым убачыў у канцы вёскі дзве крытыя машыны. Мусіць, думаю, забралі людзей. Але — не, аднавяскоўцы ўжо дагаралі...»

Ён пазнаў маці па залатых зубах — у яе адзінай на ўсю вёску былі такія. Яна разам з адным з сыноў ляжала ў баку ад згарэлага дома: відаць, атрымалася вырвацца, але іх усё роўна напаткала варожая куля. Дзесяць дзён і начэй дальвінцы ляжалі пад адкрытым небам — ланцугі немцаў, якія адступалі, цягнуліся і цягнуліся праз ужо мёртвую вёску, што не давала магчымасці пахаваць нябожчыкаў. 29 чэрвеня, калі савецкія танкі былі побач, у Дальву прыйшлі жыхары навакольных вёсак і партызаны — людзей пахавалі ў брацкай магіле.

Той жудасны летні дзень, калі здарылася трагедыя, Мікалай Гірыловіч называў чорным панядзелкам. Ён шмат абдумваў яго, пракручваў да драбніц і часта задаваўся пытаннем: чаму ён застаўся жывы, чаму не апынуўся побач са сваёй сям'ёй у тым кастры? І сам жа знаходзіў адказ: «Гасподзь пакінуў мне жыццё, каб было каму расказаць...» Дый расказаў, на ўвесь свет агучыў трагедыю Дальвы, пра якую мы, сучаснае пакаленне, не маем права забыцца.

Дзякуючы гэтаму легендарнаму чалавеку, які ўсё сваё далейшае жыццё прысвяціў увекавечанню памяці роднай вёскі і яе жыхароў, 15 ліпеня 1973 года ў Дальве з'явіўся мемарыяльны комплекс. Сёлета той падзеі спаўняецца паўвека. Мемарыял дапамагалі ўзводзіць школьнікі, моладзь, вайскоўцы, Дзяржтэлерадыё БССР, дзе Мікалай Гірыловіч працаваў начальнікам апаратна-студыйнага комплексу. Ён, заслужаны сувязіст Беларусі, быў знаёмы з вядомым скульптарам Андрэем Бембелем, які выкладаў у тэатральна-мастацкім інстытуце (цяпер — Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў). Той і прапанаваў правесці сярод студэнтаў конкурс на найлепшы праект мемарыяла. Перамагла работа нікому не вядомага тады Уладзіміра Церабуна, які праз шмат гадоў калі не перасягнуў, то стаў побач са сваім настаўнікам. У ліпені 1973 года адбылося адкрыццё мемарыяльнага комплексу ў Дальве.

Сёння яна — гісторыка-культурная каштоўнасць, сімвал памяці аб бязвінна загінулых мірных жыхарах, вёска-помнік. Прыгожая жанчына, якая застылымі вачамі глядзіць уперад, і маленькі хлопчык, які яе абдымае, маркотна схіляючы галаву, — так скульптар увекавечыў маці Мікалая Гірыловіча і аднаго з яго братоў. Гледзячы на жаночую постаць, заўважаеш круглявы жывот — маці Гірыловіча чакала яшчэ адно дзіця. У тым жудасным полымі загінуў яшчэ не народжаны чалавек...

На працягу доўгіх гадоў Мікалай Пятровіч быў сябрам нашай газеты. Пачынаючы з 1990-х гадоў «Звязда» з'яўлялася інфармацыйным партнёрам усіх работ, што праводзіліся на мемарыяльным комплексе. Цяпер калектыў падтрымлівае адносіны з яго жонкай, Рымай Ігараўнай, якая свята беражэ памяць і аб сужэнцы, і аб той справе, якой ён прысвяціў свой век.



**Скульптура «Маці з сынам» у мемарыяльным комплексе «Дальва».**

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

Каляровы сусвет

# Як ад узораў на падушках залежала замужжа

## Да Марыі Прыходзькі наведваюцца, як у мастацкі музей



**Сямейнае шчасце яна прывабіла рознакаляровымі крыжыкамі на тканіне. Веткаўская рукадзельніца захоўвае вытканы і вышыты пасаг, які рыхтавала разам з мамай амаль паўстагоддзя таму.**

Марыя Пятроўна і Пётр Пятровіч Прыходзькі самі родам са знакамітай Неглюбкі. Але шмат гадоў жывуць у Ветцы. У іх доме — цэлы музей вышыўкі і тканых вырабаў. Марыя Пятроўна вышываць навучылася, калі ёй яшчэ не было і шасці гадоў.

— У нас у вёсцы, а мы жылі на выселках, у пасёлку за Неглюбкай, доўга не праводзілі электрычнасці. Вечарамі з мамай усе садзіліся за стол, запальвалі газніцу і рукадзельнічалі. Збіраліся не толькі сваёй сям'ёй — прымалі ў сябе жанчын-суседак. Хто ткаў, хто праў, хто вышываў. Мама мая, Анастасія Іванаўна, была знакамітая ў Неглюбцы майстрыха. Многія дзяўчат менавіта яна навучыла ткаць, набіваць узоры, вышываць. Да нашых дзён яе ткацкі станок захоўваецца ў Веткаўскім музеі, — расказвае гераіня.

Вялікія вышываныя работы Марыя самастойна магла зрабіць ужо з пятнаццаці гадоў.

— Прыбягу са школы і хуценька саджуся за ўрокі, каб пасля паспець нешта вышыць. Вядома, вышывалі, ткалі мы толькі зімой. Улетку і ў сезон, увесну і ўвосень рукадзельнічаць было няма калі: шмат работы ў агародзе і па гаспадарцы, якую тады трымалі вельмі вялікую. Калі была малая, вышывалі толькі чорнымі і чырвонымі ніткамі, бо каляровых не было ўвогуле адкуль дастаць, — згадвае майстрыха.

Марыя Пятроўна расказвае, як у часы яе дзяцінства і юнацтва ў сем'ях любая зношаная кофтачка, старэнькія дзіцячыя штонікі распускаліся на нітачкі: у справу ішло ўсё, каб можна было зрабіць каляровыя работы.

— Памятаю, як мама ездзіла ў Гомель і там ужо на прадукты мяняла ніткі. Работнікам на фабрыцы выдавалі брак — бабіны нітак, якія парваліся ці былі вымазаныя ў машынным масле. Вось гэты брак можна было абмяняць на хатнюю ежу. Мама прывязе мяшок нітак такіх, мы ўжо ўсе сядзім і па нітачцы разблытваем: і ўсё ў клубочкі, у клубочкі, бо маме трэба было памагчы, — успамінае Марыя Пятроўна.

Як яна запомніла, першыя ніткі мулінэ — шчасце для вышывальшчыц — сталі прыносіць да іх каравашнікі, як тых называлі павяскоўваму. Гэта былі людзі, якія збіралі другасную сыравіну па вёсках — рызззё, метал. І прыносілі свае тавары для вяскоўцаў. За грошы мулінэ, дарэчы, яны не прадавалі, толькі мянялі на прадукты. З мулінэ вясковыя майстрыхі маглі ўжо цалкам «палотны пісаць».

— Гаспадыні ды дзеўкі адна перад адной выстаўляліся, спаборнічалі. У нас былі дзяўчаты і жанчыны, якія ўмелі самі ўзор прыдумаць і вышыць яго. Я сама не ўмела, прасіла іншых. Хтосьці дзяліўся сваімі вышыўкамі, каб ты ўжо ўзор скапіравала, а хтосьці хаваў, каб ніхто нават не бачыў. Але і скапіраваць трэба было ўмець. Дадуць малюнак для падушкі, напрыклад, перазняць за ноч. Сядзіш ужо і спаць не кладзешся. У нас тады не было ні канвы, нічога такога. Проста па тканіне адзначыш цэнтр іголачкай і ўжо ідзеш рабіць узор адразу ў адзін бок ад цэнтра. Пасля сама такі ж вышыеш, каб сіметрычна было. Ужо як старэйшая стала і была магчымасць, то ўзоры перамалёўвала ў сшытак, — тлумачыць суразмоўніца.

Сёння Марыя Пятроўна вышываць больш нічога не можа: зрок падводзіць. Але за жыццё яна бачыла столькі прыгожых узораў, што з заплюшчанымі вачыма, навобмацак, згадае: гэта работа яе ці маці.

«Цяжка сучасным дзяўчатам растлумачыць, якая сіла цягне ноч не спаць, кожную вольную хвілінку выкарыстоўваць, каб вышываць падушкі прыгожыя. Каб ужо пасля выставіць на ложку іх, і ўсе пабачаць, што ў доме дзяўчына дастойная, гаспадарная», — успамінае яна.

У вёсцы такі парадак быў натуральным.

— Казалі: хто замуж возьме, калі пасаг сабе добры і прыгожы не збярэш? Дзяўчат, якія ленаваліся, у нас называлі «чапурушкі». І таты над жаніхом кпілі: «Ну і чапурушку ты ўзяў», — смяецца рукадзельніца. — Нас у мамы пяцёра было. Усім яна дапамагала падрыхтаваць пасаг.

Да свайго вяселля Марыя Пятроўна вышыла парныя падушкі. На іх — райскія птушкі і надпіс-пажаданне, які чытаецца, толькі калі птушкі на вышыўцы глядзяць адна на адну.

— У неглюбскіх было правіла не толькі прыгожы пасаг збіраць — усю бялізну, падушкі, — але і абавязкова, каб у хаце прыгожыя вышытыя дываны, ручнікі, фіранкі былі, — кажа Марыя Пятроўна.

У гэтага ўбрання, па яе словах, таксама быў гадавы цыкл.

— Найлепшыя вышытыя фіранкі віселі на партрэтах — фотакарткі ў адной вялізнай раме, і на іконах на покуці. Зімой, калі больш печ топіца, лаўчэйшае, як у нас казалі, вышытае здымалі і больш простае вешалі. Так і тады, калі Вялікі пост ішоў, усё больш сціплае вывешвалася. Перад Вялікаднем пачыналася мыццё, прыборка і ўжо на свята даставалі і развешвалі самае лепшае, — згадвае суразмоўніца.

Вытканыя, вышытыя старыя вырабы, звяртае ўвагу Марыя Пятроўна, трэба таксама ўмець захоўваць у хатніх умовах. Важна правільна мыць і сушыць, берагчы ад прамых сонечных промняў, бо старыя чорныя ніткі ў аснове, асабліва тканых рэчаў, моцна выгараюць, сыходзяць у зелень.

Цікава, што ў сваім доме гасціную, якая больш нагадвае музейны пакой работ народных майстрых, — сям'я Прыходзькаў выкарыстоўвае для штодзённага жыцця. У Марыі Пятроўны і Пятра Пятровіча пяцёра ўнукаў. Адны ўжо выраслі, іншыя — даганяюць.

— Унучка малодшая, Златушка, любіць і з канструктарам пагуляць, і ў хованкі за падушкамі. Потым набегаецца, ляжа і кажа: «Бабуля, у цябе тут нават ляжаць прыгожа», — смяецца Марыя Пятроўна.

Веткаўчанка прызнаецца, што ў сваёй сям'і любоўю да вышыўкі яна, на жаль, пакуль заразіць нікога з дзяцей і ўнукаў не змагла. Але бачыць прыгожае ў звычайных рэчах і адразу ўвасобіць на паперы тыя вобразы вельмі добра ўдаецца старэйшай унучцы, якую назвалі ў гонар бабулі, — Марыя.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота аўтара.**

# ЗАМКІ, ШАБЛІ, ЗУБРЫ...

## Падарожжа па Гродзенскім краі

**Гродзеншчына... Чароўны край, дзе і за год, напэўна, не аб'едзеш усе цікавінкі — старажытныя замкі, палацы і храмы, шляхецкія сядзібы, старыя млыны і бровары, лясныя азёры і пракаветныя пушчы... Звыш сямі соцень помнікаў архітэктуры, гісторыі, археалогіі і мастацтва налічваецца ў вобласці. Тры з іх уключаныя ў спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Адных палацава-паркавых ансамбляў тры дзясяткі... Штосьці сусветна вядомае, штосьці вядомае толькі знаўцам, але не менш цікавае... Чарговы выязны семінар Нацыянальнага агенцтва па турызме якраз і быў прысвечаны турыстычнаму патэнцыялу Гродзеншчыны — і экалагічнаму турызму, і культурнаму.**

### СКАРБЫ «САЛАМЯНАГА ПАЛАЦА»

Ракаўскі тракт... Менавіта па гэтым старажытным гасцінцы і выпраўляешся да горада на Нёмане. Шкада, тая гістарычная назва не захавалася... За акном аўтобуса пабліскваюць між цёмных стваloў ліп крыжы мінскай Кальварыі, самага даўняга гарадскога некропаля... Вось ужо і горад скончыўся, не агледзішся — Ракаў. Мястэчка, дзе калісь сходзіліся гандлёвыя шляхі, — самае месца, каб аднавіць традыцыі ды ладзіць буйныя кірмашы! Старажытныя Валожын, Іўе, Ліда, Шчучын, Скідзель... Выехалі рана, таму, калі пачалася Налібоцкая пушча, каля дарогі ў ранішнім тумане можна было заўважыць то палахлівых казуль, то тарпанаў — дзікіх коней.

У пушчанскіх нетрах — толькі ўжо іншай пушчы, Азяранскай, — наш першы прыпынак... Аграгарадок Азёры ўпершыню згадваецца ў летапісах у 1398 годзе. Яшчэ Вітаўт тут княжыў, паляваў на зуброў, якіх сёння блукае па тутэйшых лясах з паўтысячы. Потым мястэчка належала Юрыю Радзівілу, гарадзенскаму старасту па мянушцы Геркулес, — гэта адна з яго дачок, Барбара, стане легендарнай каралевай... У Азёрах, як у традыцыйным беларускім мястэчку, на рынкавым пляцы побач касцёл і царква. Свята-Духава царква будаваная ў 1866-м на месцы драўлянага храма XVIII стагоддзя. Яна каменная, прысадзістая, бутавы камень урачыста спалучаецца з пабеленымі часткамі... А вось касцёл Валадара Хрыста побач выглядае не зусім звычайна — ён адноўлены на месцы згарэлага з белай сілікатнай цэглы.

Адметнае мястэчка і тым, што з канца XVIII стагоддзя перайшло ва ўладанне графа Валіцкага... Фантастычны персанаж! Сапраўднае яго імя — Міхась Міцкевіч, былы вучань Менскага езуіцкага калегіума і дробны шляхцюк. Але такі ж авантурны ды дзёрзкі... Навучыўся добра гуляць у більярд ды карты, хоць неадвойчы сам быў аблупежаны да пабіты. А ў эпоху, калі гулялі ўсе, ставячы на кон манеты стосікамі, гэта было важкае ўменне. Такім чынам Міхась Міцкевіч купіў сабе прозвішча Валіцкі, графскі тытул і пасаду падстоляга кароннага, быў прадстаўлены да французскага двара, гуляў у карты з каралевай Марыяй-Антуанетай і вярнуўся на радзіму сапраўдным магнатам... Тут, у Азёрах, ён стварае суконную і папяровую мануфактуры, а таксама будуе так званы саламяны палац на беразе возера Белае, дзе ў сціплых інтэр'ерах размяшчае экзатычныя скарбы, набытыя, хутчэй за ўсё, пасля вяртання экспедыцыі Крузенштэрна. Займаецца мецэнацтвам... Праўда, у Азёрах меліся і ямы, куды граф садзіў непакорлівых сялян і цешыўся іх крыкамі...

У Азяранскай царкве заўважаем старыя абразы і скульптуры, падобна, яшчэ ўніяцкія... Цяпер тут ідзе рэстаўрацыя. А вось ізноў рэліквія: Евангелле, якое, згодна з дарчым надпісам, ахвяраваў царкве ў суседняй вёсцы Бершты ў 1867 годзе Казімір Галецкі з сям'ёй.

### САФАРЫ НА ДРЫЗІНЕ

А наш шлях — далей, у пушчу... Тут, у заказніку «Азёры», маецца ўнікальная вузкакалейка — калісь па ёй вазілі з мясцовых балот торф. Сёння аднаўлена адзінаццаць кіламетраў той дарогі. Маецца і дрызіна з маторам — гэта ўжо зусім рарытэт, музейны экспанат, паўвека такіх не робяць. Цяпер гэта выдатны турысцкі маршрут, своеасаблівае беларускае сафары. Чатыры вагончыкі, сядаеш зверху, як на возе... І — наперад, у дзікую прыроду! Вагончыкі валюхаюцца, падскокваюць на сутычках, ногі кранаюцца кветак, каля твару праплывае голле... Пабліскае цёмная вада ў ручаінах... Як перліны, рассыпаныя па графскіх кілімах, зззяюць ландышавыя паляны... Балаты, гайкі, двухсотгадовыя дубы... Тут прайшоўся апошні ляднік на нашай зямлі, таму й незвычайныя краявіды — узгоркі, нізіны, шматлікія азёры... Хто не паездзіў на той дрызіне — абавязкова паспрабуйце, тры гадзіны незабыўных уражанняў! Дырэктар Рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Азёры» Дзмітрый Марозік і загадчык кафедры заалогіі і фізіялогіі чалавека і жывёл Гродзенскага ўніверсітэта Вольга Янчурэвіч у нас у якасці экскурсаводаў... Так што падчас падарожжа мы, дзякуючы ім, ведаем, якая цяпер птушка спявае... А вось гэта зусім і не птушка, а жаба! А вунь там вераценніца праслізнула... Ведаеце, як адрозніць яе ад змяі? У змей галава заўсёды ромбападобная.

Адзін з экскурсійных прыпынкаў — на жалезным мосце, ён таксама рарытэт, цераз возера Белае. Не, вада ў возеры не падобная да малака... Адкуль назва? Знайшла легенду пра юнака па імені Кань, — так называецца яшчэ адно возера, якое з'ядноўваецца з Белым. Той Кань, каб спыніць пошасць, перамог вадзянога цмока ў возеры, і ацалёныя людзі назвалі возера Белае, што значыць — чыстае.

Паміж драўлянымі шпаламі і жалезнымі канструкцыямі моста пабліскае далёка ўнізе вада, сапраўды чысцюткая... У ваду дае нырца коўра, альбо паганка вялікая, з залікшчым чорным чубам... Рыбалка тут выдатная.

А апошні прыпынак дрызіны — на Святым балоце. Унікальная мясціна ледзь зусім не знікла — з-за неабачлівага меліяратарскага энтузіязму. Сёння балота аднаўляецца. Светлы сухі трыснёг хавае цёмныя плямы вады — там гняздзяцца лебедзі. Лётаюць чаплі, дзіўна выгінаючы шыі... Увогуле птаства — як машкаты над сподачкам з сочывам! Гучаць, як цэлы аркестр. А калі яшчэ пільней прыслухацца, магчыма, пачуеш і званы, што гучаць у нетрах балота... Паводле адной з легендаў, тут стаяў храм, які аднойчы на свята разам з вернікамі праваліўся пад зямлю, і цяпер, асабліва на святы, можна пачуць людскія стогны і гук званоў...

### ВІТАЎТАЎ ЗАМАК

І які ж кантрастам у параўнанні з некранутай прыродай заказніка назаўтра выглядала Гародня з ейнымі брукаванкамі ды камяніцамі! Колькі ні бывай у горадзе, на гербе якога пераскоквае цераз загародку алень Святога Губерта з крыжам у лобе — заўсёды адкрываеш нешта новае... Тым больш гэтым разам я ўпершыню трапіла ў адрэстаўраваны Стары замак.

*«Стары, Вітаўтаў яшчэ, гродзенскі замак быў страшны... Стральчатыя гатычныя вокны палаца, грыфельныя муры, вострыя дахі са свінцовай чарапіцы, зялёная і смярдзючая вада бяздонных равоў, вузкія, як шчыліны, байніцы верхняга і ніжняга бою. Ля Саляной вежы — камяністы, касталомны зрыў да ракі. А ля яе — узгорак, вышэйшая кропка Замчышча, гародненская Галгофа...»* Так стварае атмасферную карціну XVI стагоддзя Уладзімір Караткевіч у рамане «Хрыстос прызямліўся ў Гародні».



З муроў замка паглядаў на Нёман вялікі князь Вітаўт. Давыд Гарадзенскі адбіваў напады крыжакоў. Тут, вярнуўшыся з палявання на дзікоў у Кудзінскім лесе, памёр кароль Стэфан Баторый — магчыма, быў атручаны. Хоць столькі кароль піў улюбёнага венгерскага віна, што й атруты не трэба было. Нават на смяротным ложы піў... Згодна з вынікам анатаміравання, ныркі каралеўскія былі распухлыя, як у вала.

Але замак, рэзідэнцыя вялікіх князёў і каралёў, зведаў занепад... І хоць навукоўцы яшчэ доўга будуць спрачацца, як менавіта належала яго аднавіць, ужо можна прыйсці ў аднаўленыя муры — зусім не змрочныя, наадварот, урачыстыя і светлыя. Паглядзець экспазіцыю, у якой і пра таго ж Вітаўта, і пра Давыда Гарадзенскага, і пра Стэфана Баторыя... Шмат інтэрактыву, сучасных тэхналогій — на сценах паказваюць анімацыю, на экранах — 3D-выявы экспанатаў... Можна пабываць у пакоі каралеўскага сакратара, у каралеўскай капліцы, у каралеўскай лазні... А якія печы там стаяць, абламаваныя кафляй, зробленай па ўзоры старажытнай — у кожнай пакоі непаўторная! Наверсе, з агляднай пляцоўкі, адкрываецца дзівосная панарама на горад, на Нёман, на Каложу...

### АД КАЛОЖЫ ДА ГАРАДНІЦЫ

Вядома, прыехаць у Гародню і не паглядзець на Каложскую, альбо Барысаглебскую, царкву XII стагоддзя — недаравальна! Калісьці ладдзі плылі па Нёмане і здалёк бачылі, як люструюць сонца слюдзяныя крыжы ў сценах храма, узведзенага на высокім адхоне.

Праўда, з-за такога ўзнёслага размяшчэння храм і пацярпеў: Нёман падмыў бераг, які абваліўся разам з часткай муроў...

Але не толькі стыхія руйнавала беларускія храмы. На месцы знакамітай Фары Вітаўта, кафедральнага сабора, цяпер толькі мемарыяльны знак: дзве каменныя, схіленыя адна да адной у смутку фігуры, цёмная і светлая, сімвалізуюць праваслаўе і каталіцтва, якім у розныя часы належаў храм, узарваны ў 1960-х. А насупраць — храм ацалелы, у які абавязкова варта наведацца: Кафедральны касцёл Святога Францішка Ксаверыя, з драўлянымі фігурамі на алтары работы разьбяра Яна Шміта. Наведалі мы і Вялікую харальную сінагогу, якая, па некаторых звестках, існавала яшчэ ў XVI стагоддзі... Цяпер у сінагозе рэканструкцыя, створаны музей яўрэйскай культуры, ёсць і звесткі пра Халакост — падчас Вялікай Айчыннай вайны тут было гета. Да мемарыяльнага знака на сцяне аднаго з дамоў, у памяць пра 29 тысяч вязняў гета, увесь час кладуць паводле звычая каменьчыкі... Паклалі і мы. Зайшлі і ў праваслаўны Свята-Пакроўскі сабор, з унікальнымі абразамі ў гонар навамучанікаў.

Гарадніца... Парк Жылібера... Памяць пра XVIII стагоддзе, час асветніцтва і авантур. Запрошаны з Францыі падскарбіем Антоніем Тызенгаўзам, «кашальком караля», Жан Жылібер, батанік, анатам, рэспубліканец і масон, мусіў зладзіць у Гародні медычную акадэмію і батанічны сад... Зладзіў. Вось толькі шляхта не хацела аддаваць дзяцей вучыцца «нізкаму» рамяству доктара. Таму Жылібер дамогся, каб дазволілі вучыцца медыцыне дзецям простых саслоўяў.

Вось тут дзесьці па брукаванцы хадзіў ён, хударлявы, аскетычны, імклівы, а за ім — прыручаная зубрыца, якая ела з яго капелюша сена...

Артэфакты мінулых стагоддзяў — і ў галерэі «Грышук Арсенал». Шаблі, палашы, шпагі... А яшчэ — спартыўныя ўзнагароды беларускіх алімпійцаў, з якімі сябраваў стваральнік галерэі. Ганаровы грамадзянін Гродна, калекцыянер Анатоль Грышук расказвае, што ўсё пачалося з шаблі яго бацькі, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны. Чым адрозніваецца шабля ад палаша, як насілі ордэны ў Расійскай Імперыі, для чаго крылатым гусарам былі крылы — экскурсія тэатралізаваная, вясёлая... А яшчэ прывабна, што многія экспанаты — не муляжы, арыгіналы, — можна памацаць, прымераць. У двары галерэі Анатоль Грышук мяркуе зрабіць фотазону: сцяну распішуць у выглядзе антычнага порціка, з вядомымі персанажамі беларускай гісторыі. Дарэчы, галерэя — лаўрэат XX Рэспубліканскага турыстычнага конкурсу «Пазнай Беларусь — 2022» у намінацыі «Прыватныя музейныя ініцыятывы».

### РЭЗІДЭНЦЫЯ ВАЛОВІЧАЎ

Апошні пункт падарожжа — Свяцк. Рэзідэнцыя Валовічаў. Славуты род, які вядзе пачатак з XV стагоддзя. Будаўніцтва палаца пачалося ў XVIII, пры маршалку гродзенскім Юрыі Валовічы і ягоным сыне Антоніі. Архітэктара выпісалі аж з Італіі. Знакамітыя мастакі Манькоўскі і Смуглевіч зрабілі фрэскі. Мелася зала ў пампейскім стылі — арыстакратыя тады дужа захаплялася засыпаным попелам антычным горадам. У рамантычнай зале столь была распісаная пад неба... Але час усё няўмольна знішчыў. У 1930-х у гэтых мурах працавала наркалагічная лячэбніца, пазней — санаторый для сухотнікаў... Потым палац стаяў пусты. Урэшце занядбаны будынак, калісьці велічная рэзідэнцыя ў стылі класіцызму, быў перададзены санаторыю «Азёрны». У 2017-м пачалася рэстаўрацыя... І вось скончана першая чарга. Атэль у левым флігелі, піўная рэстарацыя, залы для канферэнцый... А будзе шматфункцыянальны аздараўленчы комплекс, у самым прывабным месцы — і Гродна непадалёк, і Аўгустоўскі канал, і экалагічныя пушчанскія сцежкі... Падчас круглага стала нам паказалі праект: адновяцца пейзажная зала, зала Імператарскіх партрэтаў і антычная «Зала вакханалій». Урачыстую парадную лесвіцу прыкрасяць скульптуры, у зімовым садзе зазеляняюць і ўспыхнуць кветкамі экзатычныя расліны...

...У заплечніку ляжалі свечкі з натуральнага воску, уласнаручна скручаныя падчас майстар-класа на прадпрыемстве «Мядовы шлях», у смартфонах стваралася папкі фота з новага падарожжа, над аўтобусам уладна кружлялі буслы... Гарадзеншчына прыадчыніла браму скарбаў, каб мы вярталіся і вярталіся да яе.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Вилейский райагросервис»

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена без НДС на основании п. 1.33. ст. 118 Налогового кодекса Республики Беларусь, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. номером 631/С-59381 (назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом, площадь – 64,3 кв. м). Составные части и принадлежности: одноэтажный блочный оштукатуренный жилой дом с верандой | Минская обл., Вилейский р-н, Осиповичский с/с, д. Осиповичи, ул. Центральная, 75 | 65 985,18 | 6 598,52 | 3 299,26 |
| 2 | Капитальное строение с инв. номером 631/С-59389 (назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом, площадь – 70,1 кв. м). Составные части и принадлежности: одноэтажный блочный оштукатуренный жилой дом с холодной пристройкой, сараем | Минская обл., Вилейский р-н, Осиповичский с/с, д. Осиповичи, ул. Центральная, 82 | 112 579,97 | 11 258,00 | 5 629,00 |
| 3 | Капитальное строение с инв. номером 631/С-58551 (назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом, площадь – 70,7 кв. м). Составные части и принадлежности: одноэтажный сборно-щитовой облицованный «Сайдингом» жилой дом с холодной пристройкой | Минская обл., Вилейский р-н, Осиповичский с/с, д. Илищевичи, 87 | 68 911,43 | 6 891,14 | 3 445,57 |
| 4 | Капитальное строение с инв. номером 631/С-58560 (назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом, площадь – 70,9 кв. м). Составные части и принадлежности: одноэтажный сборно-щитовой облицованный «Сайдингом» жилой дом с холодной пристройкой, сараем | Минская обл., Вилейский р-н, Осиповичский с/с, д. Илищевичи, 83 | 68 311,71 | 6 831,17 | 3 415,59 |
| В отношении лотов №№ 1–4 проводятся вторые повторные торги. **Стоимость снижена на 20 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 68 (29948) от 11.04.2023, стр. 2, № 96 (29976) от 23.05.2023, стр. 14 | | | | | |
| Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 621385408101000162, для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома), пл. – 0,2091 га. Право аренды.<br>Лот № 2 расположен на земельном участке с кадастровым номером 621385408101000156, для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома), пл. – 0,1351 га. Право аренды.<br>Лот № 3 расположен на земельном участке с кадастровым номером 621385404101000068, для размещения объектов усадебной застройки (для обслуживания жилого дома), пл. – 0,1336 га. Право аренды.<br>Лот № 4 расположен на земельном участке с кадастровым номером 621385404101000070, для размещения объектов усадебной застройки (для обслуживания жилого дома), пл. – 0,1106 га. Право аренды. | | | | | |
| Ограничения (обременения) в отношении лотов: ограничения (обременения) прав на капитальные строения (ипотека) в отношении лотов №№ 1-4.<br>В соответствии с п. 1 ст. 15 Закона Республики Беларусь от 20.06.2008 № 345-З «Об ипотеке» ипотека в силу реализации имущества с публичных торгов будет прекращена с момента продажи имущества посредством публичных торгов в форме открытого аукциона. Ограничения (обременения) в отношении земельных участков лотов: виды ограничений (обременений) прав: земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код – 6, площадь – 0,0145 га (в отношении лота № 1). | | | | | |
| **Дата и время проведения торгов** | | **26 июня 2023 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 | | | |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | | **с 10.00 13 июня 2023 года до 16.00 22 июня 2023 года** | | | |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ОАО «Вилейский райагросервис», проводимых 26.06.2023.

